ХАРЬКОВ 91
ПЕР. КОРОЛЕНКО 18
БИБ. КЕ КОРОЛЕНКО

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 292 (6268) | 21 снежня 1938 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

СЕННЯ Ў НУМАРЫ:

Пісьмо сям'і і сваякоў В. П. Чкалава таварышу Сталіну

У ЦК КП(б)Б.

На V пленуме ЦК ЛКСМБ.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ:

А. М. Канавалёнак — Дзейснасць палітычнай агітацыі.

Н. Хомчанка — Неабгрунтаваная баязлівасць даваць рэкамендацыі.

К. Жаўрыд — Калгасная моладзь уступае ў комсамол.

ЗААХВОЧВАЦЬ ПЕРАДАВЫХ РАБОЧЫХ, ЗМАГАЦЦА З ДЭЗАРГАНІЗАТАРАМІ ВЫТВОРЧАСЦІ:

А. А. Міленькі — Дрэнна змагаюцца з прагульшчыкамі.

С. М. Друскін — Прагульшчыкам і летунам — ніякіх дапамог.

В. Ф. Трыбуц, М. Л. Лосіна — Ва ўсім аддаваць перавагу перадавікам.

А. Позняк, Ю. Дуброўская, Я. Суша — Змяніць парадак водпуску па цяжарнасці.

ВЫВЕУ НАС ТАВАРЫШ СТАЛІН НА ЗАМОЖНЫ, СВЕТЛЫ ШЛЯХ.

А. І. Байкоў — На папяровай фабрыцы.

І. М. Лукашэвіч — У барацьбе з ворагамі.

Цяжкім быў лёс сялян.

Мінулае. Сучаснае.

Н. Вішнеўскі, Тар. Хадкевіч — Квітнее жыццё.

Ф. Садоўскі, Д. Добкін — Камісія садзейнасці перапісу насельніцтва.

ЗА РУБЯЖОМ:

Ваенныя дзеянні ў Кітаі.

Спрэчкі ў палаце абшчын.

Унутрыпалітычнае становішча ў Румыніі.

ЗАМОЖНА І РАДАСНА ЖЫВЕ КАЛГАСНАЯ ВЁСКА

З кожным днём набліжаецца вялікае свята беларускага народа — 20-годдзе ўтварэння Беларускай Совецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Разам з сацыялістычным горадам радасна і ўрачыста сустракае гэту знамянальную дату і калгасная вёска. Працоўнае сялянства Беларусі сустракае свята новымі перамогамі на кожным участку калгаснага будаўніцтва. Яно падагульвае вынікі сацыялістычнай перабудовы вёскі, праведзенай пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна. Вынікі сапраўды гістарычныя, непараўнальныя.

У мінулым Беларусь была прыгнечанай, адсталай калоніяй царскай Расіі. Абрабаваная памешчыкамі, капіталістамі і царскімі чыноўнікамі, яна ўяўляла сабой краіну лясоў і балот, галечы і жабрацтва, цемры і бескультур'я. Беларускія мястэчкі і вёскі былі нібы сімваламі крайняй беднасці і дзікасці. Асабліва жудасных размераў дасягала беднасць у Палескіх раёнах. Сярод лясоў і балот туліліся жабрацкія вёскі з непісьменным, цёмным, забітым насельніцтвам. Голад, галеча і цяжкія хваробы былі тут вечнымі спадарожнікамі працоўнага селяніна. Мала чым адрозніваліся ад Палесся і іншыя раёны мінулай Беларусі.

Раскошныя памешчыцкія маёнткі, велізарныя цэрквы і касцёлы і побач з імі — раскіданыя, пачарнеўшыя, курныя хаціны вёсак. Рэзкія кантрасты паміж зяючым багацтвам і крайняй беднасцю выступалі на кожным кроку. Вузкія палоскі сялянскай зямлі спіскаліся з усіх бакоў памешчыцкімі палямі і лясамі. Ад беззямелля і цеснаты, ад холаду і голаду селянін кідаўся ў кабалу да памешчыка, да кулака, або ішоў у горад, у няменшую кабалу да капіталіста. З працоўнага селяніна выпягвалі апошнія сокі памешчык і поп, кулак і гандляр, чыноўнік і прыстаў. Нястачы і беднасць падсцерагалі яго з маленства. Не дарэмна і старыя беларускія народныя песні, сумныя і хвалюючыя, апявалі гора, як спадарожніка жыцця працоўнага:

«Калі я маленькай у калысцы ляжала,
Гора са мной ля калыскі стаяла,
Калі я маленькай каля лаўкі хадзіла,
Гора мяне за ручаньку вадзіла.
Я ад гора на сіняе мора —
Гора са мной у човене плыве.
Я ад гора ў грыбы пайшла —
Гора за мной кошык нясе.
Я ад гора ў магілу пайшла —
Гора за мной лапату нясе».

Ад гэтага спрадвечнага гора і нядолі, ад прыгнёту і эксплаатацыі, ад жабрацтва і беспрасвецця працоўных Беларусі навекі вызваліла Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя. Вялікія геніі чалавецтва Ленін і Сталін паказалі вёсцы шлях да заможнага, светлага жыцця, шлях да сацыялізма. Ідучы па гэтаму шляху, працоўнае сялянства, кіруемае большэвіцкай партыяй, пабудавала новае жыццё — вольнае і радаснае, культурнае і заможнае.

За 20 год існавання Совецкай Беларусі карэнным чынам змянілася аблічча ўсёй краіны. Непазнавальнай стала і вёска. У буйных калгасах аб'яднаны раздробленыя аднаасобныя гаспадаркі. Складаныя сельскагаспадарчыя машыны прышлі на палі, якія раней бачылі толькі саху ды драўляную барану. Новыя жылыя дамы, прасторныя гаспадарчыя будынкі, школы і клубы, бібліятэкі і кіно, дзіцячыя яслі і больніцы надалі вёсцы новы, маляўнічы выгляд. У дамах калгаснікаў не з'яўляецца навіной электрычнасць і радыё. Не знойдзецца ні аднаго хоць-бы самага аддалёнага кутка Совецкай Беларусі, які не быў-бы закрануты гэтымі гістарычнымі зменамі, у якім не біла-б невычарпальнай крыніцай поўнакроўнае жыццё.

Яркім прыкладам гэтага можа служыць змешчаны сёння ў нашай газеце матэрыял аб мінулым і сучасным Шклоўскага раёна — аднаго з радавых раёнаў, які нічым асаблівым не вызначаецца сярод іншых раёнаў нашай ордэнаноснай Беларусі. У мінулай Шклоўшчыне, як і ўсюды на Беларусі, лепшыя землі належалі памешчыкам, царквам, кулакам. Невыносна цяжкім было жыццё малазямельных сялян і абяздоленых, бяспраўных працоўных сёл і мястэчак. Зямля для селяніна з яго дапатопнай тэхнікай з'яўлялася мачыхай. Збіраючы мізэрны ўраджай, селянін не ведаў, што з ім зрабіць—ці спачатку пакарміць галодных дзяцей, ці аддаць даўгі, ці прадаць, каб заплаціць казне падаткі.

За годы сацыялістычнага будаўніцтва непазнавальным стаў раён, як непазнавальнай стала ўся наша сацыялістычная радзіма. Навечна ўмацаваўся калгасны лад на совецкай зямлі. Ён прынёс сялянству жыццё, поўнае дастатку, поўнае глыбокай чалавечай радасці і гонару за сваю шчаслівую радзіму, за сваю вялікую партыю большэвікоў, за свайго мудрага настаўніка і правадыра—любімага Сталіна. Велізарная розніца паміж старой і новай вёскай з яркай выразнасцю вырысоўваецца не толькі на прыкладзе Шклоўшчыны, але і на прыкладах кожнага раёна, кожнага калгаса рэспублікі.

Па-новаму стала радзіць калгасная зямля, рупліва апрацоўваемая складанымі сельскагаспадарчымі машынамі. З года ў год яна прыносіць высокія сталінскія ўраджаі. У калгасе «Совецкая Беларусь» на Тураўшчыне сярэдняя ўраджайнасць за два апошнія годы склала па збожжавых культурах 16,32 цэнтнера з гектара, па бульбе — 197 цэнтнераў. Такога высокага ўраджаю дабіліся многія калгасы і раду іншых раёнаў.

З высокім-жа ўраджаем калгаснікі атрымалі важкі працадзень. У гэтым годзе, напрыклад, кожны калгаснік сельскагаспадарчай арцелі імя Валадарскага, Магілеўскага раёна, атрымлівае на працадзень 4 кгр. збожжа, 3 рублі 50 кап. грашыма, 3 кгр. бульбы, 1,5 кгр. гародніны і 5 кгр. кармоў для жывёлы. Адной толькі сям'і лепшага калгасніка Архіпа Венідзіктава належыць атрымаць 5,2 тоны збожжа, 6,5 тоны кармоў, 4.550 рублёў грашыма, шмат бульбы і гародніны. Пра такое багацце не мог і марыць у мінулым беларускі селянін.

У новай калгаснай вёсцы выраслі і новыя выдатныя людзі. Гэта—майстры высокага ўраджаю, стаханаўцы сацыялістычных палёў і жывёлагадоўлі, барацьбіты за яшчэ больш заможнае і шчаслівае жыццё. Знатнымі людзьмі вёскі сёння з'яўляюцца тыя, хто даказаў на справе сваю адданасць калгаснаму ладу, сацыялістычнай радзіме, партыі Леніна—Сталіна. Сотні імёнаў знатных стаханаўцаў — трактарыстаў, камбайнераў, ільнацерабільшчыкаў і іншых прадстаўнікоў новых прафесій на вёсцы—ведае і ганарыцца імі Совецкая Беларусь. Лепшыя прадстаўнікі беларускага калгаснага сялянства выбраны дэпутатамі Вярхоўных Советаў СССР і БССР.

Росквіт калгаснай вёскі, заможнае і радаснае жыццё калгаснікаў — гэта вынік няўтомных клопатаў большэвіцкай партыі, совецкага ўрада і вялікага Сталіна аб сялянстве. У непарыўным саюзе з рабочым класам, сялянства шчыльна з'яднана вакол партыі Леніна—Сталіна. Шчырымі, задушэўнымі словамі песень, частушак, казак услаўляе народ радзіму, партыю, вялікага генія чалавецтва, тварца самай дэмакратычнай ва ўсім свеце Канстытуцыі, якая яркімі, жыватворчымі прамеснямі асвятляе шлях да комунізма.

На шчаслівае жыццё, на радасць народа пасягалі тройчы прэзрэнныя трацкісцка-бухарынскія і нацыянал-фашысцкія бандыты. Але ні імгэтым прадажным псам фашызма, ні іх фашысцкім гаспадарам ніколі не ажыццявіць сваіх крывавых планаў, бо на варце сусветна-гістарычных заваёў Вялікага Кастрычніка, на варце шчаслівага жыцця краіны стаіць увесь магутны совецкі народ разам з непераможнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй.

ПІСЬМО СЯМ'І І СВАЯКОЎ В. П. ЧКАЛАВА таварышу СТАЛІНУ

Сям'я і сваякі Валерыя Паўлавіча Чкалава выражаюць Вам, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, глыбокую і сардэчную прызнацельнасць за тое спачуванне і клопаты, якія Вы праявілі да нас у гэтыя цяжкія горасныя дні.

З асаблівай любоўю мы ўспамінаем Вашы нязменна-чулыя бацькоўскія адносіны, якія заўсёды сустракаў у Вас Валерый Паўлавіч.

Яго гутаркі з Вамі, указанні, якія ён атрымліваў ад Вас, нязменна нараджалі ў ім пачуццё гордасці і ўпэўненасці; выхоўвалі ў ім мужнасць і няўхільнае імкненне дабівацца новых перамог у славу сацыялістычнай радзімы.

Гэтымі пачуццямі, гэтымі настроямі Валерый заражаў і нас, блізкіх яму людзей.

У нечакана паспешным нас велізарным няшчасці вялікім супяшэннем з'яўляецца сазнанне, што Вы, Іосіф Вісарыёнавіч, сумелі з чуллівымі клопатамі майстэрскага садоўніка вырасціць стойкага пітомца — большэвіка Валерыя Паўлавіча Чкалава, адданага сына радзімы, аддаўшага ўсё сваё жыццё без астатку за справу сацыялізма.

Мы будзем захоўваць у сэрцах светлы вобраз незабыўнага мужа, бацькі, сына, брата і абяцаем Вам, родны і любімы бацька Іосіф Вісарыёнавіч, чэсна і стойка працаваць, каб апраўдаць высокае званне членаў сям'і і сваякоў Валерыя Паўлавіча Чкалава.

Ольга ЧКАЛАВА
Ігар ЧКАЛАЎ
Алексей і Зінаіда ЧКАЛАВЫ
Наталія ЧКАЛАВА
Сёстры Софія і Анна ЧКАЛАВЫ
Владзімір і Юрый ФРОЛІШЧЭВЫ
Нікіфар і Канстанцін ГАРДЗЕЕВЫ
Марыя ОРЭХАВА
Георгій ОРЭХАЎ
Еўгенія ОРЭХАВА

«Правда» 20 снежня.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

У паўночнай частцы правінцыі Хунань кітайскія войскі паспяхова развіваюць наступальныя аперацыі. Перадавыя часці кітайскіх войск дасягнулі раёна, размешчанага ў дзесяці кілометрах ад Іочжоу (на поўдзень ад Уханя). Японскі гарнізон у Іочжоу складаецца з адной брыгады. 18 снежня 1.000 чалавек, уваходзіўшых у саставу японскай брыгады, адыйшлі ад Іочжоу ў паўночным напрамку. Японскія часці, займаючыя Талін (на паўночны ўсход ад Іочжоу), рыхтуючыся да адыходу ад займаемага пункта, разбураюць тэлеграфную і тэлефонную сувязь.

З Наньчана (сталіца правінцыі Цзянсі) паведамляюць, што 18 снежня ноччу кітайскі батальён фарсіраваў раку Сюхэ і раптам атакаваў умацаваныя японскія пазіцыі на паўднёвы захад ад Дэані. У рэзультаце жорсткага бою японцы, страціўшы больш тысячы чалавек забітымі і раненымі, у беспарадку адыйшлі ў паўночным напрамку. Кітайскія атрады прадаўжаюць праследваць адступаючыя японскія часці.

У ПАУДНЁВЫМ КІТАІ

Развіваючы контрнаступленне ў раёне Кантона, кітайскія войскі падыйшлі да Саньцзяна, размешчанага ў 10 кілометрах на поўнач ад Кантона.

На ўчастку на ўсход ад Кантона, кітайскія войскі за апошнія дні правялі рад паспяховых аперацый. Заняўшы Бало, кітайскія войскі прадаўжаюць прасоўванне ў бок Цзэнчэна і занялі 5 населеных пунктаў. У апошніх баях на гэтым участку японцы страцілі звыш 2 тыс. чалавек забітымі і раненымі. Кітайскія войскі захапілі вялікую колькасць зброі і боепрыпасаў.

17 снежня кітайская авіяцыя бамбардыравала японскія пазіцыі ў Цзенчэне і Шылуне, прычыніўшы японцам вялікія страты.

18 снежня японская канонерка абстраляла Пакхой (паўднёва-заходняе ўзбярэжжа правінцыі Гуандун). Аднача сова два японскія самалёты бамбардыравалі Пакхой з паветра. Забіта 23 мірных жыхары.

У ПАУНОЧНЫМ КІТАІ

На поўдні правінцыі Шаньсі ў раёне Янчэна японскія войскі, атрымаўшы вялікае падмацаванне, занялі нядаўна горныя праходы. Аднак 16 снежня кітайскія часці рашучым ударам прымусілі японцаў адступіць з займаемых імі пазіцый. У баях японцы страцілі 500 чалавек забітымі і раненымі.

Па спазніўшыхся вестках, 13 снежня японцы трымя калонамі агульным лікам у тысячу чалавек атакавалі кітайскія пазіцыі на поўнач ад Чжун-Яна (заходняя частка правінцыі Шаньсі). Атака была адбіта. Японцы, страціўшы 300 чалавек забітымі і раненымі, адыйшлі ў паўночна-ўсходнім напрамку, кінуўшы вялікую колькасць зброі і боепрыпасаў.

СПРЭЧКІ Ў ПАЛАЦЕ АБШЧЫН

ЛОНДАН, 20 снежня. (ТАСС). Учора на пасяджэнні палаты абшчын лейбарыст Дальтон унёс ад імя лейбарыстскай апазіцыі рэзалюцыю, у якой выказваецца вотум недавер'я англійскаму ўраду. Выступаючы ў абарону рэзалюцыі, Дальтон заявіў, што за апошнія 7 год палітыка ўрада разбурыла сістэму безапаснасці, аслабіла абарону краіны і стварыла, такім чынам, сур'ёзную пагрозу для Англіі.

Закранаючы становішча на Далёкім Усходзе, Дальтон запытаў, ці намеран урад аказаць дапамогу Кітаю, які з'яўляецца членам Лігі нацый і аказвае супраціўленне грубай несправакаванай агрэсіі з боку Японіі. Затым Дальтон сказаў, што мюнхенскае пагадненне не ўміратварыла Еўропу і «наўрад ці ёсць зараз у Еўропе такая граніца, якую можна было-б разглядаць, як больш ці менш безапасную».

Спыніўшыся на становішчы ў Чэхаславакіі і, у прыватнасці, у Закарпацкай Украіне, Дальтон патрэбаваў, каб Чэмберлен праінфарміраваў дэпутатаў аб тым, што намеран зрабіць урад, каб прыпыніць насоўваючуюся небяспеку ва Усходняй Еўропе.

Далей Дальтон прасіў Чэмберлена растлумачыць, у якой меры апошнія падзеі, якія мелі месца ў Чэхаславакіі, а іменна, прапанова стварыць карыдор, праходзячы праз усю Чэхаславакію, закранае англійскія гарантыі новых граніц Чэхаславакіі і ці намеран Чэмберлен прадаставіць Германіі поўную свабоду дзеянняў для перакройкі ўсёй карты Усходняй Еўропы? Дальтон таксама прасіў Чэмберлена паведаміць, якія крокі намеран прадпрыняць англійскі ўрад для абароны англійскіх правоў у Міжземным моры. Закранаючы становішча ў Іспаніі, Дальтон заявіў, што апазіцыя патрабуе, каб Чэмберлен ясна заявіў аб пазіцыі ўрада ў гэтым пытанні і запэўніў, што без згоды парламента правы ваючай стараны генералу Франко не будуць прадастаўлены.

З адказам Дальтону выступіў Чэмберлен, які яшчэ раз указаў на агульнасць англійскіх і французскіх інтарэсаў і падкрэсліў, што Англію і Францыю звязваюць цесныя ўзы дружбы. Закранаючы становішча ў Іспаніі, Чэмберлен не адмаўляў, што за апошнія месяцы генералу Франко была аказана «некаторая дапамога як войскамі, так і ўзбраеннямі». Гэта дапамога, сказаў Чэмберлен, была, відаць, часткова аказана Італіяй. Але ўзнікае пытанне, прадаўжаў ён, «ці з'яўляецца італьянская дапамога, аказаная генералу Франко, настолькі істотнай, каб яе можна было разглядаць, як парушэнне абавязацельстваў, узятых італьянскім урадам па англа-італьянскаму пагадненню».

УНУТРЫПАЛІТЫЧНАЕ СТАНОВІШЧА Ў РУМЫНІІ

БУХАРЭСТ, 19 снежня. (ТАСС). 13 студзеня ў Румыніі апублікован дэкрэт караля аб стварэнні новай палітычнай партыі «Фронт нацыянальнага адраджэння». З гэтага часу палітычная дзейнасць магчыма толькі ў рамках гэтай партыі, а «ўсякая другая палітычная дзейнасць», як гаворыцца ў арт. 7 дэкрэта, «лічыцца падпольнай і караецца па закону».

Стварэнне новай палітычнай партыі азначае спробу караля стварыць масавую базу для каралеўскай дыктатуры

Як вядома, у пачатку бягучага года ў Румыніі была зроблена спроба ўстанаўлення адкрытай фашысцкай дыктатуры на чале з агентам германскага фашызма ў Румыніі Гога. Пасля адстаўкі Гога, новы ўрад Мірона Крыстэа пачаў узмоцнена праводзіць «унутрыпалітычную кансалідацыю» па італьянскаму ўзору. У Румыніі былі забаронены ўсе палітычныя партыі і была прынята новая канстытуцыя, надзвычай ўзмацняючая ўладу караля.

Пасля падзелу Чэхаславакіі націск германскага фашызма на паўднёва-ўсходнія краіны Еўропы ўзмацніўся. Румынія прыцягвае ўвагу Германіі сваімі нафтавымі і лясными багаццямі і сельскагаспадарчымі прадуктамі. Актывізавалася і румынская агентура германскага фашызма — «Жалезная гвардыя». Ёсць падставы меркаваць, што жалезнагвардзейцы мелі мэтай устараніць рад відных дзеячоў цяперашняга рэжыма, у тым ліку і караля.

30 лістапада пры пераводзе з адной турмы ў другую главар «Жалезнай гвардыі» Кодрэану і 13 яго прыспешнікаў былі забіты пры спробе ўцячы.

Германскія фашысты, узмацняючы сваю падрыўную дзейнасць у самой Румыніі, разам з тым пачалі ўзмоцнена заахвочваць венгерскія рэвізіяністскія дамаганні на румынскія тэрыторыі. Германскія фашысты хочуць тут забіць адразу двух зайцоў: адцягнуць Венгрыю ад дамаганняў на Закарпацкую Украіну і паставіць Румынію перад фактам актывізацыі венгерскіх дамаганняў на Трансільванію і Банат.

Стварэннем новай партыі «Фронт нацыянальнага адраджэння» румынскі ўрад і кароль спадзяюцца ўмацаваць сваё становішча.

У новую партыю ўвойдуць, як відаць, младз-лібералы і частка членаў былой нацыянал-царанісцкай партыі (група Калінеску — Гельміжану), падтрымліваючая цяперашні рэжым. Не выключана магчымасць змянення адносін да астаткаў «Жалезнай гвардыі».

16 снежня 50 чалавек, у тым ліку цяперашнія і былыя міністры, іх намеснікі і дэпутаты звярнуліся да ўрада з пісьмовай просьбай дазволіць дзейнасць партыі «Фронт нацыянальнага адраджэння».

Сярод падпісаўшых заяву — старшыня румынскай соцыял дэмакратычнай партыі Грыгаровіч.

Прыезд у Венгрыю італьянскага міністра замежных спраў Чыано

ПРАГА, 19 снежня. (ТАСС). Італьянскі міністр замежных спраў Чыано прыбыў сёння ў Будапешт. На вакзале Чыано быў сустрэт прадстаўніком венгерскага рэгента (правіцеля) Хорці, міністрам замежных спраў Чакі, і чыноўнікамі раду другіх міністэрстваў. Прысутнічалі таксама пасланнікі Італіі, Германіі, Японіі і акрэдытаваны ў Будапешце «пасланнік» генерала Франко.

Сёння адбылася першая сустрэча Чыано з Чакі, а затым з Хорці. Як перадаюць з паінфармаваных крыніц, Чыано абмяркуе з дзяржаўнымі дзеячамі Венгрыі рад пытанняў, у тым ліку пытанні аб «умацаванні італа-венгерскай дружбы»; аб адмаўленні Венгрыі ад далучэння да яе Закарпацкай Украіны і ад устанаўлення агульнай польска-венгерскай граніцы; аб венгерска-румынскіх адносінах (як перадаюць, Чыано рэкамендуе венгерскаму ўраду ўстанавіць прыязныя адносіны з Румыніяй). Намечана таксама абмеркаваць пытанне аб далейшым развіцці эканамічных і культурных адносін паміж Венгрыяй і Італіяй». У прыватнасці, гутарка ідзе аб увядзенні ў вышэйшых школах Венгрыі італьянскай мовы ў якасці абавязковай.

Стаханавец ільнаводства тав. Фёдар Сямёнавіч Хліманцаў (калгас «Новае жыццё», Шклоўскага раёна). Фото Я. Салавейчыка.

У ЦК КП(б)Б

Учора ў памяшканні ЦК КП(б)Б адбылася рэспубліканская нарада парторгаў пярвічных калгасных партыйных арганізацый па пытанню росту партыйных калгасных арганізацый і радоў партыі на сяле. У нарадзе прынялі ўдзел 43 парторгі.

Выступаўшыя партыйныя арганізатары дзяліліся вопытам сваёй работы. Яны расказвалі, як растуць рады партыі за лік лепшай часткі калгаснікаў.

Парторг калгаса імя Куйбышэва, Прапойскага раёна, тав. Разінаў расказаў, як расце іх калгасная партарганізацыя. За гэты год яны прынялі ў кандыдаты партыі 11 калгаснікаў, у члены партыі перавялі 5. Новапрынятыя ў ВКП(б) упягнуты ў актыўнае партыйнае жыццё.

Аб адсутнасці дапамогі з боку інструктараў райкома гаварыла парторг калгаса «Шлях соцыялізма», Петрыкаўскага раёна, тав. Картынік Анастасія:

— Інструктары райкома,—адзначыла яна,—паяўляюцца ў калгасе, галоўным чынам, як упаўнаважаныя па гаспадарчых кампаніях.

На нарадзе таксама выступілі тт. Даніленка (парторг калгаса «Чырвоны будаўнік», Камарынскага раёна), Арцеменка (калгас «Пяцігодка ў чатыры гады», Віцебскага раёна), Абрамаў (калгас імя Будзённага, Уваравіцкага раёна), Расюк (калгас «Чырвоны араты», Камарынскага раёна) і інш. Усяго выступіла 12 чалавек.

Нарада паказала, што на месцах з боку райкомаў партыі вельмі мала аддаецца ўвагі пытанню арганізацыі самастойных пярвічных партарганізацый непасрэдна ў калгасах.

НА V ПЛЕНУМЕ ЦК ЛКСМБ

Учора, 20 снежня, на пленуме ЦК ЛКСМБ прадаўжаліся спрэчкі. Выступаўшыя таварышы рэзка крытыкавалі антыпартыйную практыку, парочны стыль у кіраўніцтве ЦК ЛКСМБ. Бюро ЦК ЛКСМБ па сутнасці спыніла работу па выкрыццю і выкарчоўванню варожых элементаў у комсамоле, стала на няправільны шлях агульнага аднаўлення ў комсамол людзей, якія потым выкрываліся як ворагі народа.

У апараце ЦК ЛКСМБ панавала сямейнасць, кругавая парука, зажым крытыкі і самакрытыкі, глушыліся сігналы комсамольцаў. Сакратары ЦК тт. Кавалькоў, Каралёў, Мацюшка капіравалі гнілую антыпартыйную практыку былых кіраўнікоў ЦК ВЛКСМ, культывіравалі няправільны падбор кіруючых комсамольскіх кадраў. Да людзей падыходзілі не па палітычных і дзелавых адзнаках, а па асабістаму знаёмству. Так былі пасланы на кіруючую комсамольскую работу тт. Масанін, Сіляёў, Новікаў, Гурэвіч і інш.

Сакратар Віцебскага гаркома комсамола т. Кручонак у сваім выступленні крытыкуе членаў бюро ЦК, якія адарваліся ад нізавых комсамольскіх арганізацый. Сакратар ЦК т. Мацюшка, будучы ў Віцебску, ніякай дапамогі не аказвала. Сакратар ЦК т. Каралёў груба адносіцца да кіруючых комсамольскіх кадраў, не адказвае на іх запросы. Віцебскі абком комсамола працуе выключна дрэнна. Сакратар оргбюро ЦК ЛКСМБ тт. Новікаў і Гурэвіч вырашаюць усе пытанні сямейным парадкам, не карыстаюцца аўтарытэтам у комсамольцаў.

— ЦК ЛКСМБ няправільна падбіраў кіруючыя комсамольскія кадры, — гаворыць сакратар Уздзенскага райкома комсамола т. Аронава. — Людзі, якія правальвалі работу, кампраметавалі сябе, пакрываліся, а іх зноў вылучалі на адказныя пасты.

У комсамольскай арганізацыі Беларусі ўсыплялася большэвіцкая пільнасць. ЦК ЛКСМБ па сутнасці паклаў пад сукно рашэнні IV пленума ЦК ВЛКСМ аб выкрыцці і выкарчоўванні ворагаў народа. Сакратар Ельскага райкома комсамола т. Шульгін і іншыя ў сваіх выступленнях прыводзілі многа прыкладаў, калі ЦК наперакор патрэбаванням нізавых комсамольскіх арганізацый аднаўляў у комсамоле палітычна сумніцельных людзей, якія потым выкрываліся органамі НКВД як ворагі народа.

Сакратар Лагойскага райкома комсамола т. Пракопчык расказала аб парочнай практыцы ЦК і Менскага абкома. Тав. Мацюшка і сакратар Менскага абкома т. Сіляёў прыязджалі ў раён проста для прагулкі. Яны не аказвалі ніякай дапамогі ў практычнай рабоце. У абкоме комсамола нельга атрымаць адказу па хвалюючых пытаннях.

Выступаўшыя рэзка крытыкавалі сакратароў оргбюро ЦК ЛКСМБ па Магілеўскай вобласці тт. Масаніна і Бурачэнка, якія замест дзелавой работы займаліся барацьбой за партфелі. Гэтыя кіраўнікі адарваліся ад комсамольскіх арганізацый і не ўзначалілі палітычнага выхавання комсамольцаў. Аб дрэннай рабоце Масаніна было добра вядома ЦК і ў прыватнасці тав. Кавалькову. Між тым, усё гэта старанна пакрывалася.

На пленуме выступалі члены бюро ЦК тт. Клебанаў, Тулякоў і сакратар ЦК т. Мацюшка. Замест таго, каб расказаць пленуму аб антыпартыйнай практыцы кіраўніцтва ЦК ЛКСМБ, яны гаварылі ўпоўголаса, стараліся абыйсці вострыя вуглы і змазаць палітычную сутнасць рашэнняў VII пленума ЦК ВЛКСМ.

Трэба сказаць, што сакратар ЦК ЛКСМБ т. Каралёў у сваім выступленні імкнуўся перакласці адказнасць за справы, якія тварыліся ў ЦК на другіх. Ён стараўся апраўдаць сябе, як мэладога работніка. Між тым, т. Каралёў ведаў аб парочных справах і не прыняў ніякіх мер, каб дапамагчы комсамолу своечасова ўскрыць няправільную палітычную лінію ў рабоце ЦК ЛКСМБ.

Рэзка крытыкавалі ўдзельнікі пленума члена бюро ЦК т. Цыкіна, які праваліў работу фізкультурных арганізацый Беларусі. У ЦК больш года таму назад паступілі кампраметуючыя матэрыялы аб Цыкіне, але т. Кавалькоў на іх не рэагаваў.

Выступаўшыя з усёй большэвіцкай рашучасцю ўскрывалі гнілы стыль кіраўніцтва палітычна абанкротыўшыхся «кіраўнікоў» ЦК ЛКСМБ.

У рабоце пленума прымаюць удзел члены бюро ЦК КП(б)Б, сакратары ЦК КП(б)Б тт. Панамарэнка і Грэкава, сакратар ЦК ВЛКСМ т. Мышакова.

Сёння працяг работы пленума.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ДЗЕЙСНАСЦЬ ПАЛІТЫЧНАЙ АГІТАЦЫІ

З мэтай азнаямлення працоўных з рашэннямі партыі і ўрада, міжнародным становішчам, з мэтай разгортвання стаханаўскага руху, социялістычнага спаборніцтва па рашэнню ЦК КП(б)Б па рэспубліцы быў праведзен адзіны палітдзень.

Рад гаркомаў і райкомаў партыі (Гомельскі, Віцебскі гаркомы, Сталінскі, (Менск), Дрысенскі, Рэчыцкі, Ельскі райкомы і рад іншых) правялі адзіны палітдзень, як масавае палітычнае мерапрыемства, на высокім ідэйна-палітычным узроўні.

У гэтых раёнах пытанне аб арганізацыі палітдня было абмеркавана на пасяджэнні райкомаў КП(б)Б, у пярвічных партарганізацыях. Партыйныя арганізацыі зацвярджалі планы падрыхтоўкі палітдня, вылучалі дакладчыкаў На прадпрыемствах, ва ўстановах, калгасах, сярод хатніх гаспадынь, адна асобнікаў былі праведзены гутаркі—групавыя і індывідуальныя, сабраны цікавячыя працоўных пытанні, якія групаваліся ў партарганізацыях, вывучаліся і, выходзячы з гэтага, агітатары будавалі даклады, каб адказаць на хвалюючыя пытанні.

Арганізаваны і праведзены палітдзень у калгасе «12-годдзе Кастрычніка», Жлобінскага раёна, і праведзены адзіны палітдзень у іншых раёнах павысілі ідэйна-палітычны ўзровень працоўных, мабілізавалі іх на выкананне палітычна-гаспадарчых задач, на выяўленне, выкрыццё і знішчэнне ворагаў народа — трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх агентаў фашызма.

Палітычная работа расшырыла спаборніцтва ў калгасах. Цэлы рад калгасаў Рэчыцкага раёна, як напрыклад, «Рэчыцкая праўда», імя Варашылава, «Вызваленне БССР» і інш., поўнасцю выканалі ўсе абавязацельствы перад дзяржавай па ўсіх відах натуральных паставак і грашовых плацяжоў. 91 гаспадарка аднаасобнікаў уступіла ў калгасы. У Дрысенскім раёне пасля правядзення палітдня рад калгасаў («Маяк», Сар'янскага сельсовета, «Першае мая», Бігосаўскага сельсовета і рад іншых) поўнасцю выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай і прадалі вялікую колькасць хлеба дзяржаве.

Палітдзень азнаёміў працоўных з палітычнымі пытаннямі Ён дапамог усвярдзіць істотныя недахопы ў рабоце калгасаў, фабрык і заводаў, совецкіх і гаспадарчых устаноў Партарганізацыі зараз прыступілі да рэагавання на выяўленыя недахопы.

Такія рэзультаты арганізацыі і правядзення палітдня ёсць далёка не ва ўсіх раёнах. Значная частка райкомаў (Менскі сельскі, Суражскі, Быхаўскі і рад іншых) палітдзень праводзілі фармальна, у парадку дакладаў, без збору пытанняў і папярэдняй падрыхтоўкі; некаторыя-ж, як Варашылаўскі горкам г Менска, Уваравіцкі і інш. зусім не правялі палітдня. Гэта становіцца нічым іншым растлумачыць нельга, як безадказнымі адносінамі сакратароў райкомаў да выканання рашэнняў ЦК КП(б)Б.

Практыка правядзення палітдня паказала, што добра арганізаваны і праведзены палітдзень з'яўляецца адной з асноўных форм палітычна-масавай агітацыі.

Партарганізацыі павінны праводзіць палітдні па тэмах: «XX год ўтварэння БССР», на антырэлігійныя тэмы, аб міжнародным становішчы, па рашэннях партыі і ўрада і іншых пытаннях з абавязковай усебаковай папярэдняй падрыхтоўкай палітдня.

Неабходна замацаваць выяўлены актыў, расшырыць яго, весці сістэматычную работу з ім, уцягваючы лепшых людзей у рады ВКП(б), групы спачуваючых, вылучаць на адказныя работы.

Праводзімая масава-палітычная работа мабілізуе працоўных на своечасовае выкананне палітычных і гаспадарчых задач, яшчэ мацней згуртоўвае іх вакол вялікай партыі большэвікоў, яе Цэнтральнага Камітэта і любімага правадыра народаў усяго свету таварыша Сталіна.

А. М. КАНАВАЛЕНАК,
інструктар аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б.

НЕАБГРУНТАВАНАЯ БАЯЗЛІВАСЦЬ ДАВАЦЬ РЭКАМЕНДАЦЫІ

Наша партыя карыстаецца гарачай любоўю ў працоўных мас. Лепшыя людзі нашай радзімы імкнуцца назаўсёды ўмацаваць сваю сувязь з партыяй, уступіць у яе рады Кожны комуніст абавязан дапамагаць партыі індывідуальна адбіраць у партыю перадавых людзей нашай радзімы, з асяроддзя рабочых, калгаснікаў і совецкай інтэлігенцыі.

Перадавыя людзі, якія імкнуцца ўступіць у рады ВКП(б), часам сустракаюць перашкоды ў атрыманні рэкамендацый. Некаторыя комуністы самастрахоўваюцца, баяцца даваць рэкамендацыі нават тым таварышам, якіх добра ведаюць. Гэта ўпаўне можна сказаць аб старшыні любаньскага райвыканкома тав. Гальчэні. Ён на партыйных сходах часта выступае і крытыкуе нізавыя партыйныя арганізацыі за слабую работу па росту радоў ВКП(б). Між тым словы яго разыходзяцца з дзеяннямі.

Райком комсамола рэкамендаваў у кандыдаты партыі комсамольца тав. Шулякоўскага. Яму далі рэкамендацыі яшчэ два комуністы. Неабходна была толькі пятая рэкамендацыя. Тав. Шулякоўскі звярнуўся да тав. Гальчэні, (які жыў з ім у адной вёсцы, ведае яго па практычнай рабоце). Не было ніякага сумнення, што тав. Гальчэня дасць рэкамендацыю, бо ён мне, парторгу, некалькі раней расказваў аб Шулякоўскім, як аб добрым таварышу.

Надзея не апраўдалася: старшыня райвыканкома тав. Гальчэня адмовіўся рэкамендаваць у партыю комсамольца тав. Шулякоўскага. Свае яўна самастрахоўніцкія дзеянні ён прыкрыў тым, што, моў, тав. Шулякоўскі дрэнна працуе. Такое сцвярджэнне з'яўляецца няправільным. Тав. Шулякоўскага ў 1938 г., як лепшага комсамольца, вылучылі на пасаду намесніка дырэктара МТС па разліках. Абавязкі свае ён выконвае добра, праўда, ёсць недахопы. Аднак, кроўная-ж справа райкома партыі выхоўваць маладыя кадры, дапамагаць ім авалодваць майстэрствам кіраўніцтва.

Такім чынам, матэрыял аб прыёме ў партыю комсамольца тав. Шулякоўскага ляжыць у партарганізацыі МТС неразгледжаным.

Вядома, рэкамендацыі патрэбна даваць людзям усебакова правераным Тут законна настаражонасць, каб не даць магчымасці пранікнуць у рады ВКП(б) варожым элементам. Аднак небяспечна самастрахоўка, якая перашкаджае ўступленню ў ВКП(б) людзям, якія варты насіць высокае званне комуніста.

К. ХОМЧАНКА,
парторг пярвічнай партарганізацыі Любаньскай МТС.

КАЛГАСНАЯ МОЛАДЗЬ УСТУПАЕ Ў КОМСАМОЛ

СТАРЫЯ ДАРОГІ. На 1 студзеня 1938 года комсамольская арганізацыя раёна налічвала ў сваіх радах 568 чалавек. За 11 месяцаў гэтага года раённы камітэт комсамола прыняў у комсамол 718 чалавек перадавой калгаснай моладзі, бязмежна адданай нашай радзіме і вялікай партыі Леніна — Сталіна.

Комсамольская арганізацыя калгаса імя Сталіна, Нова-Дарожскага сельсавета, за 1938 год прыняла ў рады комсамола 22 чалавекі, комсамольская арганізацыя калгаса «Герой працы» — 20 чалавек. У комсамол уступаюць перадавыя людзі. Так, напрыклад, прынята ў комсамол тав. Лапацік Ольга Андрэеўна, якая, працуючы на свінатаварнай ферме, дабілася стопроцантнага захавання маладняка. Комсамолка тав. Лапацік была занесена на дошку гонару імя 20-годдзя ВЛКСМ.

Комсамольская арганізацыя калгаса «Большэвік», Крываносаўскага сельсавета, за апошнія 5 месяцаў вырасла на 14 чалавек. У рады комсамола прыняты лепшыя стаханаўцы. Сярод іх тав. Сайко Ольга Фёдараўна, якая, працуючы на палявых работах, выконвала дзённыя нормы на 230—290 проц.

Раённым камітэтам комсамола створана ў калгасах 29 новых пярвічных комсамольскіх арганізацый. 39 комсамольцаў, якія актыўна ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, рэкамендаваны райкомам комсамола ў кандыдаты партыі.

К. Н. ЖАУРЫД.

ПУБЛІЧНАЯ ЛЕКЦЫЯ У КАЛГАСНЫМ КЛУБЕ

ПЕТРЫКАЎ. У клубе калгаса «Другі з'езд калгаснікаў-ударнікаў», Смятаніпкага сельсовета, райком партыі днямі арганізаваў публічную лекцыю па першай тэме гісторыі ВКП(б) — «Барацьба за стварэнне социял-дэмакратычнай рабочай партыі ў Расіі».

Лекцыю слухала больш 200 чалавек. Сярод іх—работнікі МТС, чыгуначнікі, совецкая інтэлігенцыя сяла і калгасны актыў.

ЗААХВОЧВАЦЬ ПЕРАДАВЫХ РАБОЧЫХ, ЗМАГАЦЦА З ДЭЗАРГАНІЗАТАРАМІ ВЫТВОРЧАСЦІ

ДРЭННА ЗМАГАЮЦЦА З ПРАГУЛЬШЧЫКАМІ

У нашым рамачным аддзяленні другога хромавага цэха ёсць дзесяткі кадравых рабочых, людзей, якія аддаюць усе свае сілы на карысць социялістычнай радзімы. Пераважная большасць рабочых добрасумленна і самааддана выконвае свае абавязкі.

Адзначаючы добрасумленную работу лепшых рабочых, перадавых стаханаўцаў, мы ні ў якім разе не павінны ўмаўчаць аб парушальніках працоўнай дысцыпліны. У нашым аддзяленні маюць месца прагулы па няўважлівых прычынах. Нярэдкі і выпадкі спазнення ў работу. Аднак усе гэтыя факты парушэння працоўнай дысцыпліны праходзяць міма цэхавай профарганізацыі.

Калі адміністрацыя завода прымае якія-небудзь меры да прагульшчыкаў, выносячы ім тое або іншае спагнанне, то профарганізацыя праяўляе ў гэтым пытанні выключную нейтральнасць. Яшчэ не было выпадку, каб пытанне аб працоўнай дысцыпліне абмяркоўвалася калі-небудзь на цэхавым сходзе.

Рамшчыца нашага аддзялення Белаброві́к часта прагульвае, яна сістэматычна на 10—15 мінут спазняецца на работу. Гэты факт не адзінкавы. Мне і многім іншым рабочым неаднаразова прыходзіцца аставацца працаваць на другой змене, замяняючы прагульшчыкаў. Гэта адмоўна адбіваецца на прадукцыйнасці працы, якасці прадукцыі. Апрача таго, звышчасовая работа вельмі дорага абыходзіцца прадпрыемству.

Карыстаючыся тым, што завод адчувае недахоп у рабочай сіле, прагульшчыкі, летуны беспакарана зрываюць выкананне плана і намнога паядаюць плады стаханаўскай работы.

Пара пакончыць з гэтым. Патрэбна, каб кадравыя рабочыя, даўно і добра працуючыя на прадпрыемстве, карысталіся-б большымі правамі ў параўнанні з навічкамі, а тым больш летунамі і прагульшчыкамі: пераважна заблеспечваліся кватэрамі, пуцёўкамі ў дамы адпачынку, курортамі і т. д.

А. А. МІЛЕНЬКІ,
стаханавец-рамшчык другога хромавага цэха менскага скурзавода «Большэвік».

ПРАГУЛЬШЧЫКАМ І ЛЕТУНАМ—НІЯКІХ ДАПАМОГ

Зусім правільна і своечасова рабочыя і служачыя ўзнялі праз друк пытанне аб барацьбе з прагульшчыкамі, летунамі і іншымі дэзарганізатарамі працоўнай дысцыпліны. І на нашым піваараным заводзе «Беларусь» ёсць нямала фактаў парушэння працоўнай дысцыпліны, няправільнага атрымання бюлетэняў па хваробе і т. д.

Мне, як старшыні страхавога совета, гэта асабліва відаць. Я часта бываю на кватэрах хворых і ў гэтым на канкрэтных фактах пераконваюся.

Месяц таму назад механік завода тав. Палонскі захварэў грыпам і атрымаў бюлетэнь па часовай непрацаздольнасці на тры дні. Не гледзячы на гэта, Палонскі ў часе хваробы ўмудрыўся выконваць работу па ўстаноўцы чанаў для бражэння піва. Калі яму зрабілі заўвагу, што ён па бюлетэню грошы не атрымае, то ён кінуў работу і зусім пакінуў завод. Адзін з возчыкаў завода зрабіў прагул. Каб атрымаць грошы за гэты дзень, яму якімсьці чынам удалося на другі дзень атрымаць у заводскім медпункце бюлетэнь. У нас на заводзе ёсць работніца Расцішэўская, якая працуе на вытворчасці ўсяго адзін год. За гэты час яна больш карысталася бюлетэнямі, чым працавала на вытворчасці. І характэрна, працаваць яна, як быццам, не ў стане, кожны дзень прыходзіць на завод з атрыманнем саладзіны для кармлення сваёй жывёлы—можа.

Падобных фактаў можна было-б прывесці яшчэ не мала. Іх на заводзе ёсць многа. Аднак заводскія арганізацыі не вядуць ніякай барацьбы з гэтым злом. У выніку — прагульшчыкам, лодырам, людзям, якія наогул працуюць на заводзе некалькі месяцаў, пад відам хваробы часта ўдаецца атрымліваць бюлетэні. Прыкрываючыся гэтымі бюлетэнямі, яны зусім незаконна атрымліваюць многа тысяч рублёў з фонду социяльнага страхавання.

У далейшым неабходна правесці рэзкую грань паміж чэснымі рабочымі стаханаўцамі, старымі кадравікамі, людзьмі, якія прапрацавалі на вытворчасці толькі некалькі месяцаў або год. Не можа быць ніякай ураўнілаўкі ў атрыманні дапамогі па часовай непрацаздольнасці. Прагульшчыкам, лодырам, летунам патрэбна наогул спыніць выдачу дапамогі.

С. М. ДРУСКІН,
старшыня страхавога совета завода «Беларусь».

Ва ўсім аддаваць перавагу перадавікам

Найвялікшыя правы маюць працоўныя нашай краіны. Карыстаючыся гэтымі правамі, абсалютная большасць рабочых нашага цэха добра працуюць, добрасумленна, як свядомыя члены социялістычнага грамадства, выконваюць свае абавязкі.

Але даўно час узняць пытанне аб тых людзях, якія не жадаюць лічыцца з інтарэсамі вытворчасці і сістэматычна і злосна парушаюць працоўную дысцыпліну. І ў нашым чамаданным цэху, на жаль, ёсць асобныя рабочыя і работніцы, якія не чэсна адносяцца да работы. Ёсць у нас у цэху работніца Сенько. На фабрыку яна прышла не так даўно. Здавалася-б, чаго прасцей, працуй чэсна і цябе будуць паважаць, акружаць увагай і клопатамі. Умовы для добрай работы ў нас ёсць. Трэба прама сказаць, дрэнна працуе Сенько, нядбайна адносіцца да матэрыялу. За гэта ёй ужо абвясцілі вымову. Гэта, як бачна, не паслужыла ёй урокам. Днямі яна зрабіла прагул, тым самым нанесла вялікую шкоду фабрыцы.

Яшчэ горш паступіла работніца Ф. Я. Галаўлёва. Яна без усякіх уважлівых прычын нядаўна зрабіла тры прагулы. Праўда, яе знялі з работы, але якую вялікую шкоду яна прынесла цэху. Работніцы Ф. Я. Авербух і Мамелзінава гэтымі днямі таксама зрабілі прагулы і пасля гэтага зусім не з'явіліся на фабрыку.

Мы лічым зусім недапушчальным, калі прагульшчыкі і летуны карыстаюцца аднолькавымі правамі з чэснымі перадавымі рабочымі на адпачынак, на дапамогу па хваробе і іншымі прывілегіямі. Неабходна ўнесці адпаведныя змены ў нашы законы, каб добрасумленныя рабочыя-кадравікі карысталіся перавагай пры атрыманні ўсялякага роду дапамог.

В. Ф. ТРЫБУЦ, М. Л. ЛОСІНА,
работніцы чамаданнага цэха фабрыкі імя Куйбышэва.

Змяніць парадак водпускаў па цяжарнасці

Трэба павесці сур'ёзную барацьбу з летунамі, прагульшчыкамі, рвачамі, якія не даражаць інтарэсамі вытворчасці.

У прыватнасці, наспела пытанне аб змяненні парадку выплаты пасобій і прадастаўлення водпускаў па цяжарнасці. На нашай фабрыцы ёсць многа выпадкаў прыёму на работу цяжарных жанчын, якія да гэтага часу нідзе не працавалі, ці мелі многагодні перарыў. Многія з іх, прапрацаваўшы 2—3 месяцы, уходзяць у дэкрэтны адпачынак, атрымліваюць ад дзяржавы пасобіе, а пасля адпачынку на работу не вяртаюцца.

Вось, напрыклад, работніца Васілёвак, прапрацаваўшы 14 дзён, ушла ў дэкрэтны водпуск, і больш на фабрыку не вярнулася. Работніца Мідзвецкая працуе ў нас каля 2 месяцаў, хутка яна ўходзіць у дэкрэтны водпуск. Ці вернецца яна на працу, гэта — невядома.

Совецкая дзяржава праяўляе вялікія клопаты аб мацерах і дзецях. Пры нашай фабрыцы ёсць дзіцячы сад, яслі на 183 месцы. Зараз усе дзеці работніц фабрыкі маюць магчымасць знаходзіцца ў дзіцячым садзе ці ў яслях.

Велізарныя сродкі адпускаюцца ў нас на ўтрыманне дзіцячых устаноў, на бясплатную медыцынскую дапамогу, на дамы адпачынку і санаторыі, на паляпшэнне ўмоў працы рабочых і работніц. Дастаткова сказаць, што на ўтрыманне фабрычнага дзіцячага сада і ясель штомесячна выдаткоўваецца больш 25 тысяч рублёў.

Мы, мацеры, поўнасцю падтрымліваем прапанову ткачыхі-стаханаўкі Глухаўскай наваткацкай фабрыкі Соф'і Жывавай, апублікаванай 15 снежня ў «Правде», аб скарачэнні тэрміна дэкрэтнага водпуску.

Па нашай думцы, пасобіі па цяжарнасці павінны выдавацца толькі тым работніцам, якія прапрацавалі на даным прадпрыемстве прыкладна не менш года.

А. С. ПОЗНЯК,
Ю. І. ДУБРОУСКАЯ,
Я. Р. СУША,
работніцы-стаханаўкі менскай абуткавай фабрыкі імя Кагановіча.

Два браты—комуністы з калгаса «Новае жыццё», Старасельскага сельсовета, за вывучэннем гісторыі партыі. НА ЗДЫМКУ: справа налева — старшыня калгаса І. М. Лукашэвіч і старшы конюх калгаса, парторг пярвічнай партарганізацыі Г. М. Лукашэвіч.
Фото Я. Салавейчыка.

8-я армія і партызанскі рух у Кітаі

Восьмая народна-рэволюцыйная армія, кіруемая слаўнай комуністычнай партыяй і яе легендарнымі палкаводцамі Чжу Дэ, Пэн Дэ-хуэй, Хо Луч, Лін Бао вядзе пераможную ўзброеную барацьбу з японскімі захватчыкамі Падводзячы вынікі гераічнай барацьбы 8-й арміі, яе кіраўнік Чжу Дэ сказаў, што яна «мела 600 сражэнняў з японцамі. У рэзультаце гэтых сражэнняў японцы страцілі 34 тыс. забітымі і раненымі, некалькі тысяч японскіх салдат і афіцэраў было ўзята ў палон».

У першым бою з японскімі войскамі ў правінцыі Шаньсі пад Пінсінгуанем 8-я армія разграміла адну з лепшых часцей японскіх войск з 5-й дывізіі Ітагакі. З поваду гэтай буйнай перамогі кітайская газета «Дагунбао» апублікавала наступнае інтэрв'ю Чжу Дэ і яго памочніка Пэн Дэ-хуая з карэспандэнтам гэтай газеты:

«10 і 22 палкі вядомай дывізіі Ітагакі шырокай хваляй атакавалі Пінсінгуань. Аднак, не паспелі яны прайсці Сяосайдунь, як аказаліся ў вузкай даліне, па абодвух баках якой былі горы, адкуль 8-я армія нанесла ўдар. Гэтага ворагу і не снілася. Пачалася паніка сярод японцаў. Вораг аказаўся ў такім становішчы, што быў пазбаўлен магчымасці рушыцца ў які-б там ні было бок. Гэта быў выдатны выпадак для нас.

8-я армія рашучым ударам акружыла ворага, рынулася ўніз і закідала яго ручнымі гранатамі Вораг хоць і аказаў супраціўленне, аднак ён не мог разгарнуць у гэтай вузкай даліне свае цяжкія гарматы Яму асталося толькі чакаць смерці, склаўшы рукі На месцы палягла вялікая колькасць японцаў. Акрамя таго ў палон нам было захвачана звыш 1000 чалавек, таксама мы захвацілі 74 танкі, браневікі і матацыклы».

Вядомы таксама і іншыя шматлікія перамогі над японскімі захватчыкамі Народна-рэволюцыйная армія справядліва лічыцца перадавым атрадам узброеных сіл кітайскага народа ў яго барацьбе з японскай агрэсіяй «8-я армія, — пісаў карэспандэнт амерыканскай газеты «Нью Ёрк Таймс», — як прызнаюць у большасці ваенныя спецыялісты, незалежна ад іх палітычных перакананняў, з'яўляецца першакласнай баявой сілай». Такую-ж высокую ацэнку даюць і ваенным кіраўнікам гэтай арміі. Як піша той-жа карэспандэнт, «Чан Кай-шы лічыць Чжу Дэ адным з самых здольных людзей»

Часці 8-й народна-рэволюцыйнай арміі сканцэнтраваны ў асобым раёне правінцыі Шэнсі, Ганьсу і Нінься (былы совецкі раён), які ўжо стаў прыфрантавой паласой. Галоўныя яе сілы вядуць барацьбу з японскімі войскамі на паўночным фронце правінцыі Шаньсі на захад ад ракі Хуанхэ, недалёка ад асобага раёна. Некаторыя часці 8-й народна-рэволюцыйнай арміі вядуць ваенныя дзеянні ў японскім тылу, галоўным чынам, у так званым пагранічным раёне, які ахапляе заходнюю частку правінцыі Хэбей, паўночна-ўсходнюю частку правінцыі Шаньсі і паўднёвую частку правінцыі Чахар, дзе імі арганізаваны ў вялікай колькасці партызанскія атрады

Асобы раён з'яўляецца дэмакратычнай антыяпонскай базай, перадавым раёнам ва ўзброеным супраціўленні Японіі Раён мае свой дэмакратычны ўрад, падпарадкаваны цэнтральнаму ўраду Кітая. Карэспандэнт газеты «Саус Чайна Морнінг пост» піша, што ў гэтым раёне ліквідаваны ўсе падаткі, і кожны селянін робіць ураджанне самага бадзёрага і шчаслівага чалавека. Ажыццёўлена брацкае супрацоўніцтва паміж народам і ўралам, а таксама эканамічная роўнасць. Асабліва паспяховым з'яўляецца рух за роўнапрэўе жанчын. 70 проц. жанчын гэтага раёна арганізаваны ў атрады, якія актыўна ўдзельнічаюць у антыяпонскай барацьбе.

8-я армія пабудавана на новых асновах, не меўшых месца ў старой кітайскай арміі. Вялікая ўвага ўдзяляецца палітычнаму выхаванню байцоў. У арміі існуюць палітаддзелы, камісары і партыйныя ячэйкі. Прынцыпамі палітычнага выхавання з'яўляюцца: 1) адзінства камандзіраў і радавых байцоў, 2) адзінства арміі і народа, 3) агітацыя ў варожай арміі і добрае абыходжанне з палоннымі. Жалезная дысцыпліна, якая грунтуецца на свядомасці армейцаў, і іх высокі палітычны ўзровень — выдатныя якасці 8-й арміі. Гэта армія мае свае асобыя метады барацьбы, сваю ўласную дысцыпліну і свае ўласныя традыцыі. Кіруючыя яе кадры разумеюць патрэбы народных мас. Большая частка іх работы праводзіцца сярод мас. Таму, прышыўшы ў любое месца, яны атрымліваюць дапамогу з боку народа.

Ваенныя дзеянні 8-й арміі служаць прыкладам гераічнай барацьбы для ўсёй кітайскай арміі 8-я армія прынесла з сабой новую ваенную тактыку, якая, па вызначэнню правадыра кітайскай комуністычнай партыі Мао Дзэдуна, заключаецца ў спалучэнні манеўранай і партызанскай вайны з позіцыйнай. Народна-рэволюцыйная армія перадала свой многагадовы вопыт партызанскай вайны іншым кітайскім войскам.

Комуністычная партыя і кіруемая ёю 8-я армія, лічачы асновай ўзброенай барацьбы з японскай агрэсіяй нацыянальную армію, надаюць вялікае значэнне партызанскаму руху, ацэньваючы яго, як адзін з важных метадаў гераічнай барацьбы кітайскага народа супроць японскага імперыялізма. Партызанскі рух, які пачаўся ў першыя дні ўтаржэння японцаў у Кітай, неўзабаве прыняў вельмі шырокія размеры і зараз ахапляе ўсе акупіраваныя японцамі раёны У развіцці партызанскага руху найбуйнейшая роля належыць комуністычнай партыі і 8-й арміі. Імі былі створаны першыя партызанскія атрады на паўночным фронце ў правінцыі Шаньсі. Сотні тысяч патрыётаў Кітая, палаючых нянавісцю да японскіх захватчыкаў і не жадаючых ператварэння сваёй радзімы ў калонію японскага імперыялізма, уступаюць у партызанскія атрады, якія вядуць барацьбу ў японскім тылу. Аб шырокіх размерах партызанскага руху сведчыць паведамленне замежнага друку.

Амерыканская газета «Нью-Ёрк Таймс» публікуе наступныя весткі аб колькасці партызан у рэдзе акупіраваных японцамі раёнаў: ва ўсходняй частцы правінцыі Цзянсу — 85 тыс. чалавек, у правінцыі Шаньдун — 160 тыс. чалавек, у Манчжурыі—250 тыс. чалавек, у раёне Шэнхая—Нанкіна — Ханьчжоу — 120 тыс. чалавек, у пагранічным раёне правінцый Шаньсі—Хэбей—Чахар — 200 тыс. чалавек. Па вестках кітайскага друку, агульны лік узброеных партызан перавышае 1½ мільёна чалавек.

Шырокаму разгортванню партызанскага руху спрыяе палітыка тэрора, прымяняемая японскімі варварамі ў адносінах да кітайскага насельніцтва ў акупіраваных раёнах. Японскія захватчыкі забіваюць мірных жыхароў, уключаючы старыкоў і дзяцей, гвалтуюць кітайскіх жанчын, спальваюць гарады і вёскі Створаныя японцамі ў акупіраваных раёнах марыянетачныя ўрады накладаюць на насельніцтва цяжкія падаткі, канфіскуюць іх маемасць, харчовыя прадукты і забіраюць маладых жанчын для японскай арміі У Тайюне і Цясяо японскія бандыты патрэбавалі па 3 тыс. жанчын з кожнага павета. Сялянства адказвае на японскі тэрор і насіллі партызанскай барацьбой. Ведаючы зверскія адносіны японцаў да грамадзянскага насельніцтва, сяляне пры набліжэнні японскіх войск пакідаюць свае вёскі, забіраюць свае прадукты і атручваюць калодзежы. Усе маладыя мужчыны або далучаюцца да партызан, або нясуць абавязкі насільшчыкаў і разведчыкаў часцей 8-й арміі.

Разам з мужчынамі ў партызанскія атрады ўступаюць і жанчыны. У адным раёне правінцыі Шаньсі 200 гарнякоў з вугальных копяў пры наближэнні японцаў узламалі арсенал, узброіліся разам з сем'ямі і прабілі сабе шлях у безапаснае месца. Затым, раптам паявіўшыся, яны дапамаглі рэгулярным кітайскім войскам разбіць адборныя часці японскіх войск з 20-й дывізіі. Пры гэтым было забіта звыш 1.000 японскіх салдат і ўзята ў палон 500 На чале гэтых гарнякоў стаяла 61-гадовая жанчына, якую ўсе любоўна называлі мацер'ю партызан. Яна з гордасцю расказвала аб сваіх двух сынах, адзін з якіх сражаецца разам з рэгулярнымі войскамі, а другі—з партызанамі.

Партызанскія атрады прычыняюць японцам буйныя матэрыяльныя страты і ствараюць вялікія затрудненні японскай арміі. Партызаны робяць смелыя налёты на ваенныя базы японцаў, разбураюць ваенныя заводы, арсеналы, чыгуначныя лініі, пускаюць пад адкосы паязды з японскімі войскамі.

Асабліва шырока развіўся партызанскі рух у раёнах, захвачаных японцамі, дзе асталіся і змагаюцца з японскімі войскамі часці 8-й арміі, якія ствараюць партызанскія атрады і кіруюць іх барацьбой. Адным з такіх асноўных раёнаў з'яўляецца пагранічны раён правінцый Шаньсі, Хэбэй і Чахар з насельніцтвам у 10 мільёнаў чалавек. Гэты раён з'яўляецца адной з важнейшых баз антыяпонскага супраціўлення ў Паўночным Кітаі.

У пачатку 1938 года ў раёне была арганізавана ваенная акадэмія, якая карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод кітайскай моладзі, у прыватнасці, студэнцтва, многія з якіх вучацца тут змагацца і перамагаць японскіх захватчыкаў. У гэту акадэмію ахвотна паступаюць і ваенныя спецыялісты, якія жадаюць вывучыць тактыку партызанскай вайны. Праз кожныя тры месяцы акадэмія выпускае 500—700 камандзіраў партызанскіх атрадаў. Асноўнымі прадметамі, якія вывучаюцца слухачамі акадэміі, з'яўляюцца агульная ваенная адукацыя, асновы тактыкі партызанскай барацьбы і палітычная адукацыя.

Японцы, ведаючы аб існаванні ваеннай акадэміі ў прыгранічным раёне, не ў сілах знішчыць яе, хаця яна і знаходзіцца на акупіраванай імі тэрыторыі.

Другім буйным партызанскім раёнам з'яўляецца раён Шанхая, Нанкіна і Ханчжоу, дзе партызанскую барацьбу вядзе 4-я народна-рэволюцыйная армія, якая сфарміравана з партызанскіх атрадаў былых совецкіх раёнаў правінцый Цзянсі, Хунань, і кіруемая комуністамі—генералам Е-Тын і яго памочнікам Сян-Ін.

Указваючы на труднасці, якія адчуваюць японцы ў рэзультаце барацьбы партызан, газета «Пекін і Цянцзін Таймс» піша, што калі часці 8-й арміі ўходзяць з якога-небудзь горада, усё насельніцтва ідзе з імі, забіраючы з сабой харчаванне. Японцы ўваходзяць толькі ў пустыя вёскі і гарады. Калі-ж яны ідуць у сяленні за прадуктамі, яны падвяргаюцца нападу з усіх бакоў. Так бывае ва ўсіх раёнах акупіраванай часці Кітая і гэта вельмі змрочная перспектыва для японцаў

8-я народна-рэволюцыйная армія, кіруемая комуністычнай партыяй Кітая, упісала не адну слаўную старонку ў гісторыю гераічнай барацьбы вялікага кітайскага народа за незалежнасць і свабоду сваёй радзімы, барацьбы, якая, не гледзячы ні на якія труднасці, непазбежна закончыцца паражэннем японскіх агрэсараў.

А. ЧЭРКАСАЎ.

Вывеў нас таварыш Сталін на заможны, светлы шлях

* * *

СУЧАСНАЕ

проц. сялянскіх гаспадарак ўскага раёна аб'яднаны зараз у ы. На змену касе і драўлянай е прышоў трактар і камбайн. важнейшыя сельскагаспадарчыя ы зараз механізаваны. У трох на палях калгасаў працуюць 134 ары, 20 камбайнаў, 45 ільнацера- і сотні іншых складаных сель- падарчых машын. Семнаццаць саў маюць уласныя аўтамашыны. тая сетка электрычных і тэлефон- правадоў абвалаквае ўсе куткі У 51 калгасе ярка гараць элек- ыя лямпачкі Ільіча. Пры дапамо- ку ў гэтых калгасах ідзе малаць- ногія іншыя работы праводзяцца. не апрача гарадской тэлефоннай ы, якая абслугоўвае 250 абанен- ёсць 4 тэлефонныя падстанцыі. ыё і кіно не з'яўляюцца навіной працоўных раёна. 874 рыдыёточкі, дыёпрыёмнікі, 3 поўнасцю радыёфі- ыя калгасы, радыёфікаваныя пар- я аўдыторыі ёсць у раёне, 2 гу- кінотэатры і 9 перасовачных кі- ановак дэманструюць працоўным шыя совецкія кінофільмы. вязковым 7-гадовым навучаннем ены ўсе дзеці раёна. У 102 шко- у тым ліку 5 сярэдніх і 17 ня- сярэдніх) навучаецца 16.917 дзя- раёне ёсць 3 больніцы на 115 ложак, 4 здраўпункты, 3 урачэбныя кі, 3 фельчарска-акушэрскія пункты, калгасныя радзільныя дамы, 2 аторыі, туберкулёзны дыспансер тгенаўскі кабінет, начны санато- дзіцячая кансультацыя, дэзін- йны пункт, прышчэпачны пункт, экі, 5 санітарных ларкоў, магазін арыі і гігіены, 5 дзіцячых садоў д.

амоў сацыялістычнай культуры, у кожным калгасе свой клуб, тэкі, чытальні даюць магчымасць снікам праводзіць свой адпачынак а і культурна.

ікая армія совецкіх інтэлігентаў е ў раёне: 548 настаўнікаў, 23 і 90 іншых медыцынскіх работні- 18 аграномаў, 20 камбайнераў, 400 трактарыстаў, сотні служа- совецкіх устаноў, магазінаў, пош- ТС і іншых устаноў.

нілася аблічча і раённага цэнтра. слі дабротныя магазіны, школы. вялікі Дом сацкультуры, будынкі ых устаноў. Знікла былая Кар- ка—ускраіна беднаты і жабрацтва.

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ— НОВЫЯ ПЕСНІ

раней зямлі не мелі, паноў была зямля. цяпер зямлю навечна нетутцыя дала.

ырока адкрыты дзверы, е ветрыкам з ракі. ыць заможна і культурна чаць нас большэвікі.

рву аленькі цвяточак, ыкалю сабе на грудзь. ывеў нас таварыш Сталін заможны, светлы пуць.

ыць заможна і культурна — та справа нашых рук. к нам кажа родны Сталін — цька, правадыр і друг.

ней моцна я любіла шага учотчыка, цяпер я палюбіла малёт і лётчыка.

запісана ад калгасніцы Ганны Вераб'ёвай калгас «Прамень Кастрычніка», Гарадзі- анскага сельсовета).

НА ЗДЫМКУ: актыўныя ўдзельнікі гурткоў мастацкай самадзейнасці калгаса імя Леніна. Справа налева: Анастасія Капо (кіраўніца хора), Софія Дзеравяга, Анастасія Стаськова; другі рад: Ніна Хозерава, Акуліна Зубруновіч і Аляксандра Філіповіч.

НА ПАПЯРОВАЙ ФАБРЫЦЫ

Зусім побач з горадам Шкловам размешчана наша папяровая фабрыка «Спартак». У раёне яна з'яўляецца буйнейшым прадпрыемствам. Тут вырабляецца філігран, курыцельная папера, вокладка, маслёнка. Кошт гадавой прадукцыі дасягае пяці—шасці мільёнаў рублёў.

Фабрыка існуе ўжо каля сарака год. Але сапраўдным прадпрыемствам яна стала толькі пасля Вялікага Кастрычніка. У мінулым яна прадстаўляла сабой невялікае поўсаматужнае прадпрыемства, з бедным абсталяваннем, з катаржнымі ўмовамі працы. Збудаваў яе на сваёй зямлі былы царскі міністр—Крывасос Крывашэйн і, як расказваюць старыкі, праіграў потым у карты другому капіталісту — Гарнштэйне. Пры Гарнштэйне я і прышоў на фабрыку, у 1914 годзе, 12-гадовым хлопчыкам.

Цяжка ўспамінаць пра ўмовы, у якіх мы працавалі тады на фабрыцы. За 12—14 гадзін катаржнай працы падросткі атрымлівалі па 15 капеек, а дарослыя рабочыя—не больш рубля. Мордабіцце і здзекі над рабочымі з боку майстраў і ўпраўляючага былі звычайнай з'явай. Непасільная праца выматвала ўсе сокі, і людзі дачасна станавіліся старыкамі. Цяпер проста не верыцца, што мы маглі перанесці такую эксплаатацыю і здзекі. Навечна кануў у небыццё той праклятый час.

З годамі сацыялістычнага будаўніцтва вырасла зусім новая фабрыка; змяніліся людзі, працуючыя на ёй. Новы фабрычны корпус вабіць вока. Фабрыка абсталявана новымі машынамі, новай апаратурай. І рабочыя, вызваленыя ад прыгнёту і эксплаатацыі, сталі працаваць інакш. Нізмерна ўзнялася прадукцыйнасць працы. Папяровая машына, напрыклад, раней давала не больш 400 кілограмаў прадукцыі за змену, а цяпер мы на ёй выпрацоўваем да 1.200 кілограмаў. Тысячны калектыў працуе зараз на фабрыцы. За апошнія годы выраслі дзесяткі стахановцаў, якімі па праву ганарыцца фабрыка. Імёны такіх стахановцаў, як Аляксандр Кушка, Владзімір Гурыновіч і інш., вядомы ў папяровай прамысловасці.

Радасна працаваць на совецкай фабрыцы. Разам з усёй нашай краінай з кожным годам расце фабрыка, паляпшаюцца ўмовы працы, паляпшаецца добрабыт наш. Рабочыя сталі гаспадарамі свайго жыцця, і жыццё стала заможным, вясёлым, прыгожым.

А. І. БАЙКОЎ.

брыгадзір - сталачнік фабрыкі «Спартак».

* * *

З ВЕЛІЗАРНЫМІ ПЕРАМОГАМІ ПРАЦОЎНЫЯ НАШАЙ РЭСПУБЛІКІ ПРЫХОДЗЯЦЬ ДА 20-ГОДДЗЯ ЎТВАРЭННЯ БССР. СЁННЯ МЫ ДРУКУЕМ МАТЭРЫЯЛЫ АБ ЖЫЦЦІ ШКЛОЎСКАГА РАЁНА. ЯНЫ ЯРКА ПАКАЗВАЮЦЬ, ЯК ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—СТАЛІНА ЗМЯНІЎСЯ ТВАР БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ, ЯКІМ ШЧАСЛІВЫМ І РАДАСНЫМ СТАЛА ЖЫЦЦЕ ПРАЦОЎНАГА СЯЛЯНСТВА.

У БАРАЦЬБЕ З ВОРАГАМІ

Пан маёнтка Бярозаўка ўцёк разам з немцамі. Перад гэтым пад плёткамі і шампаламі кайзераўскіх салдат ён прымусіў сялян вярнуць забраную імі панскую маёмасць. Пры дапамозе немцаў з маёнтка было вывезена ўсё. У маёнтку неяк выпадкова ўцалела толькі шэсць ішакоў, разваленае гумно і апусцелы палац.

Вось на гэтых руінах нам, былым панскім батракам, прышлося будаваць новае жыццё. Арганізаваўшы таварыства па грамадскай апрацоўцы зямлі, мы пачалі разжывацца. У 1928 годзе арганізавалі калгас. Асабістым прыкладам на палях паказвалі акружаючаму аднаасобнаму сялянству ўсю велізарную перавагу калектыўнай гаспадаркі перад дробнымі, аднаасобніцкімі.

У часе калектывізацыі нашы калгаснікі многа дапамагалі сялянству ў арганізацыі калгасаў. Ворагі народа ўсяляк імкнуліся сарваць справу калектывізацыі. Нам удалося выкрыць былога панскага ўпраўляючага, які, хаваючыся ў суседняй вёсцы Забор'е, вёў падрыўную работу супроць калгасаў. Пра калгас ён расказваў розныя жудасныя небыліцы, агітаваў сялян не ісці ў калгас.

Але як-бы вораг ні маскаваўся, яго воўчы твар быў выкрыт. Калгаснікі расказалі сялянам, як гэты самы «дабрадзей» сцёбаў іх, панскіх батракоў, плёткамі.

Наперакор ворагам народа, навечна ўмацаваўся калгасны лад. Зараз у нашым Старасельскім сельсавеце ёсць 17 калгасаў. Засталося толькі 5 аднаасобнікаў. У былым панскім маёнтку былыя панскія батракі пабудавалі сабе шчаслівае, поўнае дастатку і радасці, жыццё. Калгаснікі жывуць у прасторных, светлых дамах. У калгасе пабудавана лазня, яслі, клуб. У пераабсталяваным былым панскім палацы знаходзіцца школа. Многа вырасла ў нас і дабротных гаспадарчых будынкаў. Наша племянная конеферма далёка славіцца сваімі чыстакроўнымі арлоўскімі рысакамі.

Зайдзіце зараз у кватэру да былой панскай батрачкі Аўдоцці Беляковай, якую калісь за чалавека не лічылі. Яна пачастуе вас самаю смачнаю ядою і раскажа, якім радасным і шчаслівым стала яе жыццё.

А гэта жыццё заваёвана ў жорсткай барацьбе з ворагамі народа, і ніколі нікому яго не адабраць у шчаслівага совецкага сялянства.

І. М. ЛУКАШЭВІЧ,

старшыня калгаса «Новае жыццё, Старасельскага сельсавета.

У калгаснай бібліятэцы сельгасарцелі «Спартак», Фашчаўскага сельсавета. НА ЗДЫМКУ: калгаснік сельгасарцелі «Чырвоны арацтан» Марфель атрымлівае новую кнігу. Побач бібліятэкар т. Глушынскі.

Фото Я. Салавейчыка.

ЦЯЖКІМ БЫЎ ЛЁС СЯЛЯН

У дарэволюцыйны час вёска Фашчаўка была самай глухой і беднай. Вузкія сялянскія палоскі наўкруг былі зажаты абшырнымі ўладаннямі царскага магната, міністра шляхоў зносін Крывашэйна. Лепшыя землі, сенажаці, лясы і выпасы належалі мясцовым памешчыкам Паўлыжкіным, ляснічаму Кашалеўскаму і ксяндзу.

Я меў гектар з чвэрткай зямлі. І за гэты кавалак няўдобіцы мне прышлося 12 год служыць у салдатах і больш дваццаці год пасвіць панскую і кулацкую жывёлу.

Выгляд вёскі быў панура, абшарпаны. Хаты-курніцы (печы без комінаў). Усё было чорнае, закопчанае. Амаль палавіна сялян вёскі не мелі сваіх коней. Зямлю апрацоўвалі сахою і драўлянаю бараною. Ураджаі збіралі нікчэмныя. Малацілі цапамі. Зярно добра не правейвалі — каб больш было.

Каб прывезці воз дроў, трэба было ляснічаму адпрацаваць некалькі дзён. А ўбачыць, што ты не той сук узяў, у морду яшчэ надае. Крыважэрны гэты пан быў. Не аднаго ён чалавека на той свет адправіў. Сустрэў ён аднойчы, па дарозе ў Магілеў, нябожчыка Івана Лабкоўскага, які вёз воз лазы, і прыбіў яго да поўсмерці. Тры тыдні пахварэў і, як кажуць, богу душу аддаў. А то неяк злавіў ён у лесе Марту Сенакосаву, траву яна жала там. І яе таксама на той свет адправіў.

Прабавалі з ім судзіцца за гэта. Але хіба то суд быў— адна толькі насмешка.

А то быў у нас яшчэ такі выпадак з гэтым ляснічым. Доўгі час утойваў ён ад сялян, што вёсцы належыць 17 гектараў лесу. І вось, калі сяляне даведаліся пра гэты лес, зазваў ён іх у карчму, паставіў вядро гарэлкі, і, калі яны ўпіліся— зрабіў з імі здзелку, што лес ён вёсцы верне пры ўмове, калі тры гектары яму аддадзім.

Пачалі мы судзіцца з Кашалеўскім за гэтыя тры гектары лесу. Тады ён рознымі махінацыямі прысвайвае сабе так званае Кракадзілава балота, дзе знаходзіўся ваданой і выпас для жывёлы.

Акапаўшы гэта балота, ляснічы пакінуў сялянскую жывёлу без вады і без выпасаў. І як толькі жывёліна трапіць на гэта балота, дык штраф плаці. А пойдзеш штраф плаціць, ды яшчэ калі яго ласкава не назавеш, ды шапкі не здымеш, ды не паклонішся, дык са двара выгане і сабак наскуе.

Вось якім бяспраўным, прыгнечаным, галодным і цёмным было жыццё сялян.

Запісана ад 64-гадовага калгасніка калгаса «XVII партз'езд», Івана Карнеевіча КУЛЬБАЦКАГА.

* * *

МІНУЛАЕ

Цяжкім і непрыглядным вырысоўваецца мінулае Шклова і яго ваколіц.

У другой палавіне XVIII стагоддзя Шклоў з 13-цю тысячамі душ насельніцтва быў куплен расійскай імператрыцай Екацерынай II у польскага князя Адама Чартарыйскага і перадан у якасці падарунка яе фаварыту Зорычу.

Значна раней ужо горад і яго ваколіцы належалі царскаму міністру шляхоў зносін Крывашэйну. Тысячы гектараў зямлі, папяровая фабрыка, млыны, дробныя прадпрыемствы былі яго ўласнасцю. Неларэмна сярод жыхароў Шклоўшчыны тады гаварылі: «Куды ні ткніся, усюды Крывашэйн». Побач з Крывашэйнам набівалі золатам свае кішэні фабрыкант Гарнштэйн, гандлёвы дзялец Шульман, лесапрамысловец Кацман, буйны арандатар Лейтман і дзесяткі больш дробных памешчыкаў, прадпрыемцаў, гандляроў. Як драпежныя крывасосы, яны жылі за кошт абрабаванага працоўнага насельніцтва.

У Шклове толькі адна цэнтральная вуліца, заселеная багацеямі, мела больш ці менш ахайны выгляд. За ёю пачыналіся кварталы і ўскраіны беднаты. Асабліва «славутай» ускраінай была Карпілаўка. У яе разбураных хацінах жылі жабракі, папрашайкі, ваданосы, прачкі, возчыкі, насільшчыкі. Бруд і смурод запаўнялі ўскраіну. Жыхары яе былі асуджаны на вымиранне.

А за мяжой горада раскідваліся беларускія вёскі. Курныя хаціны з цёмнымі акенцамі. Цэрквы, і побач з імі— шынкі. Вузкія сялянскія палоскі, заціснутыя з усіх бакоў памешчыцкімі землямі. Бязрадасным, тужлівым быў вясковы пейзаж. Беспрасветным, цяжкім было жыццё працоўнага селяніна. Больш палавіны ўсяе зямлі сёнешняй тэрыторыі Шклоўскага раёна належала цэрквам, памешчыкам, буйным кулакам.

Людзі раслі непісьменнымі, вабітымі. У сельскіх і царкоўна-прыхадскіх школах цяперашняй тэрыторыі раёна вучылася ўсяго каля 1000 вучняў. Каля 75 проц. насельніцтва было непісьменным. Затое на тэрыторыі раёна былі 23 цэрквы, 3 касцёлы і 20 сінагог. Папы, знахары, павітухі адурманьвалі галовы працоўным.

Памешчык і гандляр, поп і прыстаў, як крывавыя павукі, сядзелі на шыі працоўных. І не было куды скардзіцца: на насілле і здзекі, на несправядлівасці і крыўду з боку прыгнятальнікаў.

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ— НОВЫЯ ПЕСНІ

Мы калгас пабудавалі,
Імя Леніна далі,
Мы культурна і заможна
У калгасе зажылі.

Раней я была батрачка,
Усё служыла кулаку,
А цяпер я ў калгасе,
Як заможніца жыву.

Зажіпелі самавары,
Чайнікі закракалі.
Усе калгаснікі запелі,
Кулакі заплакалі.

Не йдзі, Тодар, ка мне ў сваты,
За цябе я не пайду.
Не хачу, каб муж быў лодыр, —
Я стахановца найду.

Каб нам Сталіна пабачыць,
Каб нам з ім пагаварыць,
Каб яму ды пахваліцца,
Як нам добра стала жыць!

Запісана ад калгасніцы Анастасіі КАПО (калгас імя Леніна, Рыжкоўскага сельсавета).

У калгасе імя Леніна, Рыжкоўскага сельсавета, на пабыўку прыехалі чырвонафлотцы тт. А. Н. Лашакоў і А. К. Какошка. НА ЗДЫМКУ: чырвонафлотцы сярод калгаснай інтэлігенцыі. Злева направа: рахункавод калгаса С. Ф. Дзеравяга, А. Н. Лашакоў, бібліятэкар О. С. Швуюнова, старшыня сельсавета М. Т. Паўлючэнка. Другі рад: брыгадзір Л. М. Кабанаў, А. К. Какошка, брыгадзір В. Л. Радзіеўскі.

Фото Я. Салавейчыка.

ЖЫВІТНЕЕ ЖЫЦЦЁ

асейныя і грунтавыя дарогі перали ва ўсіх напрамках палявыя абы. Уздоўж дарог прабеглі слупы з трычнымі і тэлефоннымі правадамі. лі палі бяскрайнія з рэдкімі перамі, узгоркамі, ярамі і паміж імі— асныя вёскі. Яны яшчэ здалёк выоўваюцца высока ўзнятымі радыёнамі, прасторнымі школамі і клубі, дабротнымі скотнымі дварамі і тошнямі.

ават знадворны выгляд раёна, яго ешні пейзаж расказвае пра мно-

Вы гляньце на нашу Фашчаўку, была яна і чым стала, — кажа стары калгасны вартаўнік Іван льбацкі. — Гэткае сяло, столькі зямвакол, а павярнуцца не было дзе— оды голь ды жабрацтва. З усіх баціснулі вёску паны ды падпанкі, ксёндз.

тары на момант задумваецца, пом разбягаюцца густыя маршчынкі твары.

Даўно ўсё гэта знікла, — дадае — Сёння душа не нарадуецца, калі дзіш на новую Фашчаўку, на яе даей...

Фашчаўка — гэта буйнае сяло, растае на некалькі кілометраў. Яно вілася калісьці на ўсю ваколіцу вечарным касцёлам, святочнымі кірмамі ды старынным помнікам на мо- ках ні то нейкаму знатнаму шляху, ні то каталіцкаму святому. Помк гэты вельмі хітра скарыстоўваў ёнда для адурманьвання працоўных, я сваёй нажывы. Ад той мінулай шчаўкі нічога не засталося.

У двух фашчаўскіх калгасах «Спар- » і «17 партз'езд» аб'яднаны ўсе спадаркі сяла. Як і ўсюды, тут на жным кроку, у кожнай хаце ўбачыш доказы заможнага і культурнага жыцця. Зніклі назаўсёды курныя хаціны.

Двухпавярховая школа-дзесяцігодка высіцца на ўскраіне. Побач з ёю размешчаны будынкі машына-трактарнай станцыі.

У самым пэнтры сяла — прасторны пляц для мітынгаў акружан памяшканнямі сельсавета, пошты, бібліятэкі, сельмага, хлебапякарні, дзіцячага сада, парткабінета.

Калгаснікі-стахановцы, камбайнеры, трактарысты славяцца на ўсю ваколіцу.

— Гелахава? Камбайнерка? Як-жа не ведаць яе, — кажа пажылая калгасніца. — Яна-ж — гонар нашых жанчын...

Знатнай тут з'яўляецца не адна Гелахава. Хто з фашчаўцаў не ведае трактарыстаў Фядоса Кавалёва і Андрэя Сцяпанчанка, якія далі на трактар амаль па 2 нормы выпрацоўкі за сезон, або стахановца-ільнацерабільшчыка Андрэя Чумакова, або пажылога калгасніка Антона Гадунова, або даглядчыцу маладняка Раісу Секацкую! Новымі людзьмі ганарыцца сёнешняя Фашчаўка. У ліку іх і свая, совецкая інтэлігенцыя — настаўнікі, палітасветработнікі, аграномы, медыцынскія работнікі, служачыя.

Годы сацыялістычнага будаўніцтва такім-жа чынам змянілі кожнае сяло, кожны куток раёна. У любым калгасе можна знайсці многа цікавай навізны, выдатных людзей. Калгаснае заможнае жыццё запоўнена багатым, рознастайным зместам.

У калгас імя Леніна, Рыжкаўскага сельсавета, з далёкай Балтыкі прыехалі на пабыўку чырвонафлотцы Антон Какошка — былы сакратар сельсавета і Аляксей Лашакоў — былы трактарыст. Чырвонафлотцаў акружылі аднавяскоўцы-комсамольцы і інтэлігенты, калгаснікі і калгасніцы.

— Хваліцеся, як справы там, на марскіх рубяжах... Усё ў парадку?

— А як-жа інакш... А вы чым новым парадуеце?

Пацякла задушэўная, насычаная жартамі і смехам, гутарка. Калгаснікі хваліліся новымі заваяванымі поспехамі.

І хаця чырвонафлотцы даўно ведалі пра ўсё жыццё-быццё калгаснікаў, але пажылая калгасніца — удзельніца хора Аляксандра Філіповіч пахвалілася.

— Усе 117 хат нашых калгаснікаў электрыфікаваны і радыёфікаваны. Усе мы выпісваем газеты. Не пазнаеце вы і кватэр нашых калгаснікаў: фарбаваныя падлогі, дабротная абстаноўка.

— А мяне партыйная арганізацыя прыняла ў спачуваючыя, — умяшалася другая ўдзельніца калгаснага хора Акуліна Зубруновіч.

— А ты ўсё яшчэ ўдавой жывеш? — запыталі чырвонафлотцы.

— Хоць удава, ды багатая. Выхоўваючы двое дзяцей і маючы на ўтрыманні старую матку, я толькі за гэты год зрабіла сабе пакупак больш чым на 1.000 рублёў. І Акуліна, загінаючы пальцы на руцэ, пачала пералічваць: чатыры дубовыя крэслы купіла — 88 рублёў, шафу — 160 рублёў, сыну касцюм справіла — 100 рублёў, двое ботаў дзецям пашыла — 150 рублёў, бялізны набыла на 200 рублёў, туфлі сабе купіла за 105 рублёў і поўпаліто пашыла за 350 рублёў... Вось вам і ўдава і батрачка былая...

— Ты ўжо не хваліся так Акуліна,— перабіў яе брыгадзір Владзімір Радзіеўскі. — Не адна ты так жывеш. Вазьміце хаця-б сям'ю Фядоса Пісарэнкі. 1180 працадзён яна выпрацавала. Яго кватэра не горш любога гарадскога жыхара, чыста ў ёй і ўтульна, патэфон сабе купілі...

— А хіба сям'я Емельяна Грыгор'ева менш працадзён выпрацавала? Злаецца, 1.100, — дапоўніў другі брыгадзір Лаўрэнцій Кабанаў, — толькі за гэты год больш 15 калгаснікаў перабудавалі свае дамы.

— Калі ўжо гаварыць пра заможнасць, то трэба напомніць вам, што мы ў мінулыя часы ў піліпаўку елі,—зноў заўважае Аляксандра Філіповіч.— Бывала, на снеданне чыгун бульбы ў мундзірах адварыш, з юшкай ад сялёдкі ці з паліўкай і ясі. На абед — бульба і посны крупень. А вясной адным шчаўем жывіліся. Хлеба ўдосталь ніколі не елі. А вось сёння ў мяне, напрыклад, на снеданне — сала смажанае было з адваранай бульбай, чай з булкай. На абед — боршч з мясам паставіла, аладкі і кампот. І вячэра не горшая будзе. І так кожны дзень. Па праўдзе кажучы, і на такую страву не заўсёды апетыт ёсць. Хочацца нешта падрыхтаваць больш смачнае і далікатнае.

Вечарам чырвонафлотцы весяліліся разам з калгаснай моладдзю ў прасторным калгасным доме сацыялістычнай культуры, дзе ёсць бібліятэка, якая налічвае каля 1.000 тамоў, чытальня, більярд, розныя музычныя інструменты і гульні. Тут-жа па вечарах праводзяцца заняткі гуртка па вывучэнню гісторыі партыі і гуртка агратэхнічнай вучобы.

Авалодваючы агратэхнічнымі ведамі, калгаснікі крапатліва і старанна рыхтуюць большэвіцкую сустрэчу вясне 1939 года. У наступным годзе калгасныя звеннявыя ставяць сабе мэтай перакрыць рэкорды знатных ільнаводаў раёна: Праскоўі Ганаковай, дэпутата Вярхоўнага Совета БССР — Анастасіі Міцкевіч і Хрысціны Веялкі з калгаса «Завет Ільіча», Александрыйскага сельсовета. Яны дабіліся сёлета ўраджайнасці з сваіх участкаў больш чым па 10 цэнтнераў валакна і па 8—9 цэнтнераў насення з гектара.

Такіх-жа паказальнікаў дабіліся і такія ільнаводы раёна, як Праскоўя Паборцава з калгаса імя Молатава, гэтага-ж сельсовета, Марыя Абрамовіч з калгаса «Новае жыццё», Старавадзянскага сельсовета, і дзесяткі іншых. Лён у раёне стаў сапраўднай крыніцай заможнасці калгаснікаў.

Не меншай славай карыстаюцца і лепшыя свінаркі з калгаса «Чырвоны ўдарнік», Гарадзецкага сельсовета, Марыя Серкова і Ганна Прохарава, якія ад кожнай свінаматкі выгадавалі ў гэтым годзе па 17 дзелавых парасят. А такіх стахановцаў соцыялістычных палёў і жывёлагадоўлі раён мае многа.

Выдатнымі дасягненнямі, новымі людзьмі, багатай і радаснай рэчаіснасцю ганарыцца сёнешняя Шклоўшчына. У былых панскіх маёнтках, у раскіданых вёсках і мястэчках, змяніўшых сваё аблічча, вырасшых і адбудаваных занава, квітнее тое цудоўнае жыццё, пра якое спрадвеку марыла працоўнае сялянства.

... Вечарамі гарызонт успыхвае агнямі. У калгасах загараюцца электралямпачкі і, праязджаючы такой парой па раёну, не верыцца, што гэта—адалленная ад горада сельская мясцовасць. Агні пераліваюцца воддаль прыгожа і ярка, вабячы да сябе, разганяючы густыя змрокі. У такі час ажыўлены калгасныя клубы і хаты-чытальні. Жыццерадасныя, балзёрыя песні спявае народ пра сваю радзіму, пра вялікага Сталіна.

Н. ВІШНЕЎСКІ,
Тар. ХАДКЕВІЧ.

КЛАЙПЕДА
(МЕМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ)

ДАВЕДКА

У апошнія дні клайпедскія фашысты па заданню з Берліна ўзмацнілі падрыўную дзейнасць у Клайпедскай вобласці. Адначасова германскі фашысцкі друк вядзе кампанію за адарванне Клайпедскай вобласці ад Літвы і далучэнне яе да Германіі.

Клайпедская вобласць размешчана вузкай паласой уздоўж Балтыйскага мора і заліва Курышгаф, а таксама ўздоўж ніжняга цячэння Нёмана (на правым беразе), які і з'яўляецца часткай граніцы паміж Літвой і Германіяй. Тэрыторыя Клайпедскай вобласці складае 2.848 кв. кілометраў, а насельніцтва 151.960 чалавек (паводле даных на 1 студзеня 1937 г.).

Большасць насельніцтва ў Клайпедскай вобласці складаюць літоўцы. Ёсць нязначная колькасць палякаў, яўрэяў і інш. Немцаў у вобласці налічваецца не больш 43 проц. насельніцтва.

Галоўны горад — Клайпеда (Мемель) — налічвае 38 тысяч жыхароў. Клайпедская вобласць іграе вялікую ролю ў эканоміцы Літвы, паколькі яна з'яўляецца яе найбольш развітай прамысловай вобласцю і паколькі порт Клайпеда прадстаўляе сабой адзіны выхад Літвы да мора.

Клайпедская вобласць да сусветнай вайны 1914—18 гг. уваходзіла ў склад Германіі. Па версальскаму дагавору гэта вобласць была аддзелена ад Германіі, якая абавязалася прызнаць рашэнне дзяржаў Антанты аб булучай дзяржаўнай прыналежнасці вобласці. У студзені 1923 г. Клайпедская вобласць была далучана да Літвы. 14 сакавіка 1924 г. канферэнцыя паслоў краін Антанты санкцыяніравала далучэнне вобласці да Літвы.

Главой Клайпедскай вобласці з'яўляецца губернатар, назначаемы літоўскім урадам і з'яўляючыйся яго прадстаўніком. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе дырэкторыя, старшыня якой назначаецца губернатарам, а члены дырэкторыі падбіраюцца старшынёй. Заканадаўчую ўладу ажыццяўляе сейм, налічваючы 29 дэпутатаў, выбіраемых насельніцтвам на падставе літоўскіх законаў. Дырэкторыя нясе адказнасць перад сеймікам. Нямецкая і літоўская мовы прызнаны роўнапраўнымі.

У 1935 годзе ў часе чарговых выбараў у сеймік нямецкім фашыстам у Клайпедскай вобласці дзякуючы нечуванаму тэрору і запалохванню насельніцтва пагрозай расправы пасля «далучэння» да Германіі ўдалося атрымаць большасць месц у сейміку (24 з 29). Дзякуючы гэтаму нямецкія фашысты сумелі захваціць рашаючыя пасты ў мясцовай адміністрацыі. У бягучым годзе яны патрабавалі таксама змены губернатара Кубіліуса. Пад націскам гітлераўцаў літоўскі ўрад назначыў у Клайпедскую вобласць новага губернатара — Віктара Гайліуса, які, па заяве германскага друку, з'яўляецца «ўмераным мемельскім літоўцам».

Імкнучыся захваціць Клайпедскую вобласць, германскі фашызм праследуе не толькі эканамічныя, але і стратэгічныя мэты. У выпадку захвату гэтай вобласці Германія панавала-б на абодвух берагах ніжняга цячэння Нёмана і магла-б стварыць у Клайпедзе адзін з апорных пунктаў для далейшага наступлення на прыбалтыйскія краіны, захват якіх, як вядома, уваходзіць у планы германскага фашызма. Германскі фашызм імкнецца захваціць Клайпеду, паколькі яе порт з'яўляецца важнейшым апорным пунктам у гэтай часці Балтыйскага мора.

Шырока разгорнута мастацкая самадзейнасць вучняў 1-й сталінскай школы г. Шклова. НА ЗДЫМКУ: вучаніцы Кізіна і Шынкарова за вывучэннем новых песень.
Фото Я. Салавейчыка.

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА СОВЕТА АСОАВІЯХІМА БССР

Учора ў Менску ў Доме партыйных курсаў ЦК КП(б)Б адкрыўся чацверты пленум Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма БССР. У яго рабоце прымае ўдзел звыш 200 чалавек — старшыні абласных, гарадскіх і раённых советаў Асоавіяхіма, актывісты абароннай работы прадпрыемстваў і ўстаноў г. Менска. Учора пленум заслухаў справаздачны даклад старшыні Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма БССР тав. Спасава аб рабоце асоавіяхімаўскай арганізацыі рэспублікі ў 1938 годзе і аб задачах на 1939 год.

Удзельнікі пленума чакалі ад тав. Спасава дзелавога, канкрэтнага расказу аб тым, як ідзе ліквідацыя вынікаў варожай работы арудваўшых у асоавіяхімаўскай арганізацыі ворагаў народа, якія выкрыты органамі НКВД, як Цэнтральны Совет і яго прэзідыум кіруюць умацаваннем абароннай работы на прадпрыемствах, установах і калгасах рэспублікі. На жаль, даклад тав. Спасава не зусім адпавядаў гэтым патрабаванням і не мог поўнасцю задаволіць удзельнікаў пленума.

Сёння на пленуме пачнуцца спрэчкі па дакладу. Выступаючыя таварышы павінны разгарнуць сапраўдную большэвіцкую крытыку і самакрытыку і гэтым самым намеціць далейшыя шляхі па ўмацаванню абароннай работы сярод працоўных нашай пагранічнай БССР

—o—

НАРАДА ПА ПЫТАННЮ АСВАЕННЯ МАЛЫХ РЭК

Учора ў Менску адкрылася рэспубліканская нарада па пытанню аб асваенні малых рэк, скліканая Дзяржпланам і Наркамземам БССР. У рабоце нарады прымаюць удзел работнікі аблрайпланаў, аблрайзямаддзелаў, старшыні раду калгасаў, прадстаўнікі Наркамзема СССР, Наркамвода СССР, Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута воднага транспарта (Ленінград), Упраўлення шляхоў Днепра-Дзвінскага басейна (Кіеў) і інш.

На першым пасяджэнні нарада заслухала даклад галоўнага інжынера Упраўлення воднай гаспадаркі Наркамзема БССР тав. Шчытнікава аб стане работ па транспартнаму асваенню малых рэк БССР і далейшых перспектывах.

Нарада працягнецца тры дні.

КАМІСІЯ САДЗЕЙНАСЦІ ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА

Надзвычай вялікае палітычнае і народнагаспадарчае значэнне прадстаячага перапісу насельніцтва 1939 года.

Для паспяховага разгортвання масава-растлумачальнай работы сярод найшырэйшых мас насельніцтва ў перыяд падрыхтоўкі да прадстаячага перапісу велізарнейшую ролю павінны адыграць камісіі садзейнасці перапісу насельніцтва, арганізаваныя мясцовымі советамі на прадпрыемствах, ва ўстановах, вышэйшых навучальных установах і іншых арганізацыях.

У гэтым артыкуле нам і хочацца падзяліцца вопытам работы камісіі садзейнасці перапісу насельніцтва, арганізаванай у Інстытуце народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышэва.

Камісія ставіць сваёй задачай шырока папулярызаваць прадстаячы перапіс насельніцтва, перш за ўсё, сярод усіх студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкага персанала, сярод адміністратыўных і тэхнічных работнікаў інстытута, уясніць ім палітычнае, народнагаспадарчае і міжнароднае значэнне перапісу, парадак яго правядзення і азнаёміць з пытаннямі перапіснога ліста, як адказваць на іх і т. д.

У гэтых-жа мэтах камісія садзейнасці інстытута намеціла і ажыццяўляе наступныя мерапрыемствы: членам камісіі—навуковым работнікам Б. А. Добкіным і прафесарам А. М Арціновічам праведзена ўжо некалькі лекцый-дакладаў на тэмы «Перапіс насельніцтва ў капіталістычных краінах» і «Палітычнае і народнагаспадарчае значэнне перапісу насельніцтва СССР у 1939 годзе». Гэтыя-ж лекцыі-даклады імі праведзены і будуць праводзіцца сярод студэнтаў і работнікаў у Інстытуце і інтэрнатах.

Праведзена інструктыўная нарада агітатараў, вылучаных для гутарак у інтэрнатах.

Кабінетам статыстыкі сумесна з камісіяй садзейнасці арганізавана спецыяльная выстаўка, прысвечаная прадстаячаму перапісу насельніцтва і праводзяцца сістэматычна кансультацыі па гэтых пытаннях. У агульнаінстытуцкай газеце змешчан перадавы артыкул на тэму «Палітычнае і народнагаспадарчае значэнне перапісу насельніцтва 1939 года» і намечана змяшчэнне яшчэ раду артыкулаў па гэтаму пытанню.

Асоба вялікае значэнне камісія садзейнасці надае растлумачальнай рабоце па пытаннях перапісу насельніцтва — яго падрыхтоўкі, правядзення і задачах насельніцтва ў час перапісу— на былым выбарчым участку. Для работы з хатнімі гаспадынямі на былым нашым выбарчым участку партком, па хадайніцтву камісіі, спецыяльна вылучыў 20 агітатараў, прымацаваў іх да дамоў і кватэр участка для правядзення раду (3—4) заняткаў з хатнімі гаспадынямі па пытаннях перапісу насельніцтва 1939 года. Камісія садзейнасці ўжо правяла першы інструктаж агітатараў для ўчастка, забяспечыла іх літаратурай, бланкамі перапісных лістоў і іншымі матэрыяламі, неабходнымі для правядзення гутарак. З ліку членаў камісіі садзейнасці вылучан адзін таварыш спецыяльна для сувязі з агітатарамі і для аказання ім дапамогі.

Ф. САДОЎСКІ,
Д. ДОБКІН.

АБЛАСНАЯ НАРАДА ПАЛІТАСВЕТРАБОТНІКАЎ

20 снежня ў Менску адкрылася абласная нарада палітасветработнікаў, скліканая Менскім абласным камітэтам партыі і аблана.

На нарадзе прысутнічаюць сакратары райкомаў КП(б)Б, загадчыкі райана, інспектары палітасветработы і загадчыкі дамоў соцкультуры. Нарада заслухала даклады сакратароў Плешчаніцкага і Стара-Дарожскага РК КП(б)Б і загадчыка чэрвеньскага райана аб пастаноўцы палітасветнай работы ў раёнах. Дакладчыкі ўказалі, што не ўсе дамы соцкультуры і хаты-чытальні працуюць добра. Ёсць і такія дамы і хаты-чытальні, якія лічацца толькі на паперы. У кожным раёне ёсць і кіноперасоўкі, але не ўсе яны працуюць. У Плешчаніцкім раёне, напрыклад, працуюць толькі дзве нямыя і адна гукавая кіноперасоўкі.

На нарадзе выступіў загадчык культасветаддзела абласнога камітэта партыі тав. Шупікаў, які адзначыў цэлы рад недахопаў у рабоце як дамоў соцкультуры, так і раённых арганізацый, кіруючых гэтым участкам.

Ён указаў, што і Наркомасветы і аблана слаба кіруюць гэтай работай. Яны падмянілі жывое кіраўніцтва культасветустановамі бюракратычна-папяровым кіраўніцтвам.

Нарада працягнецца тры дні і абмяркуе таксама даклад аб вячэрняй асвеце і аб 20-годдзі БССР.

Сёння працяг работы нарады.

УМОВЫ ПРЫЁМУ
на аднагадовыя курсы перападрыхтоўкі прапагандыстаў і газетных работнікаў пры ЦК КП(б)Б

На аднагадовыя курсы перападрыхтоўкі прапагандыстаў і газетных работнікаў прымаюцца загадчыкі аддзеламі прапаганды і агітацыі РК, прапагандысты — кансультанты, інструктары аддзелаў прапаганды і агітацыі гаркомаў, абкомаў, загадчыкі партыйнымі кабінетамі і дамамі партасветы, кіраўнікі семінараў прапагандыстаў і выкладчыкі гісторыі ВКП(б), рэдактары шматтыражак і раённых газет, загадчыкі аддзеламі раённых і абласных газет.

На курсы прымаюцца члены ВКП(б) з 3-гадовым партыйным стажам, ва ўзросце да 35 год.

Паступаючыя на курсы павінны мець агульную падрыхтоўку ў аб'ёме сямігадовай школы і партыйную палітычную асвету ў аб'ёме Комвуза, КІЖ'а, не менш аднагадовага стажу кіруючай прапагандысцкай або выкладчыцкай работы, а для паступаючых на газетнае аддзяленне — не менш аднагадовага стажу работы ў газеце.

Слухачы курсаў забяспечваюцца стыпендыяй у размеры 500 руб. у месяц і інтэрнатам (сем'і слухачоў курсаў кватэрамі не забяспечваюцца).

Камплектаванне на курсы праводзіцца з 15 снежня 1938 г. па 30 снежня 1938 г. Прыёмныя іспыты пачнуцца з 30 снежня 1938 г. па 15 студзеня 1939 года.

Паступаючыя на курсы павінны прадставіць у аддзел прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б наступныя дакументы:

1. Камандыроўку абкома, гаркома, райкома.
2. Партхарактарыстыку пярвічнай партарганізацыі.
3. Заяву, анкету і аўтабіяграфію.
4. Даведку аб стане здароўя і аб адукацыі.

Адрас курсаў: г. Менск, вул. Карла Маркса, д. 31. Аддзел прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б.

У цэнтры калгаса «Спартак», Фашчаўскага сельсовета, знаходзіцца паштовае аддзяленне. НА ЗДЫМКУ: ля камутатара тэлефаністка-калгасніца Б. А. Крысевіч.
Фото Я. Салавейчыка.

ДОМ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ РЫХТУЕЦЦА ДА СВЯТА

Менскі Дом Чырвонай Арміі імя К. Е. Варашылава рыхтуе дастойную сустрэчу радаснаму святу беларускага народа—XX-годдзю з дня ўтварэння БССР. 31 снежня для камандна-начальніцкага састава і членаў іх сем'яў арганізуецца вялікі карнавальны бал. У трох упрыгожаных залах адбудуцца танцы, выступленні артыстаў Масквы і Ленінграда, канцэрты чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці. У 12 гадзін ночы рознакаляровымі агнямі заззяюць новагоднія ёлкі. Цікавыя ранішнікі наладжваюцца для дзяцей. Піонеры і школьнікі сустрэнуцца з камандзірамі Чырвонай Арміі — удзельнікамі грамадзянскай вайны.

30 снежня пачнецца завочны стралковы конкурс баявых падруг. Выдатнаму святу таксама прысвячаецца завочны конкурс сярод малодшых камандзіраў на рашэнне тактычнай задачы «Аддзяленне ў абароне».

30 і 31 снежня ў басейне Дома Чырвонай Арміі адбудуцца спаборніцтвы па плаванню і прыжках у ваду з удзелам лепшых плаўпоў Масквы, Ленінграда і Менска.

Адбудзецца сустрэча па воднаму поло паміж камандамі ВЦСПС і Менскага ДЧА.

ВЫИГРЫШ У 2,5 ТЫС. РУБЛЁЎ

БАРЫСАЎ. 17 снежня раённая ашчадкаса пачала выплачваць выйгрышы па 7 тыражу пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР. За два дні выплачана 12 тыс. руб.

Значна павялічыўся рост укладаў працоўных у ашчадныя касы. За 11 месяцаў сума ўкладаў, у параўнанні з мінулым годам, павялічылася на 450 тыс. рублёў.

19 снежня жыхар горада Барысава тав. Хаіт прад'явіў райашчадкасе аблігацыю ўнутранай пазыкі 1938 года за № 40, серыя 43523 каштоўнасцю ў 100 руб., на якую па 3 тыражу паў выйгрыш ў 2,5 тыс. рублёў.

НОВЫЯ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

У Рагачоўскай машынатрактарнай майстэрні, Гомельскай вобласці, пушчана ў эксплаатацыю новая электрастанцыя. Магутнасць станцыі 75 кіловат. У дамах рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў, у пабудовах МТМ ярка загарэліся лямпачкі Ільіча.

НОВАГОДНІЯ ЁЛІ

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). Н... ідзіць новы год, рэспубліка святкаваць XX-годдзе з дня ўт... ня БССР, пачынаюцца зімовыя... кулы. Весела правядуць свята ў... Палацы піонеры і школьнікі Го...

У добрых, прасторных калонн... лах былога замка князя Паскев... падлогі да столі ўзвысяцца дзе... гожыя новагоднія ёлкі. Адна з... рыгожваецца на абаронную тэму, ... сама рознастайнымі цацкамі, пу... мі, шакаладнымі вырабамі. В... надярэададні новага года ёлкі за... запаленымі рознакаляровымі але... нымі лямпачкамі. Дзеці праслу... гутарку аб XX-годдзі БССР, а ... ракол ззяючых ёлак выступяць ... чыя самадзейныя калектывы Па... танцоры, спевакі, дэкламатары, ... канты. Усе дзеці ўключацца ў ... лыя карагоды, будуць гуляць, ... ваць, танцаваць.

Новагодні сюрпрыз рыхтуе ... піонераў самым маленькім выда... вучобы — вучням 1—3 класаў. І... рыхтаваны 1.500 падарункаў — ... кі шакаладных цукерак і цацкі.

Так шчаслівая совецкая дзетва ... значыць у сваім Палацы наступ... новага года і XX-годдзе ўтва... БССР. Палац таксама рыхтуе і ... ны адпачынак дзяцей у часе зі... канікул. Для іх у Палацы будуц... манстраваціца кінокарціны, праве... рад гутарак і лекцый аб XX-... БССР, на літаратурныя і абар... тэмы, арганізаваны калектыўныя ... і танцы, лыжныя вылазкі, паказ... стапкай самадзейнасці школ. Для... няў 9 і 10 класаў арганізоўв... тры касцюміраваныя бал-маскар... прэміямі за лепшы касцюм, за ле... выкананне танцаў.

—o—

ЭКСКУРСІІ НАСТАЎНІКАЎ БССР

ЦК профсаюза работнікаў печаці... і сярэдніх школ арганізуе ў часе ... вых канікул экскурсіі настаў... БССР. 5 экскурсантаў паедуць у ... ву, 17—у Ленінград і 25 — на ... прагас.

Для дзяцей настаўнікаў заку... 130 путёвак у мясцовыя дамы адп... ку. Адпушчаны сродкі на арганіз... новагодніх ёлак у дамах настаў... у Менску, Бабруйску, Рагачове, П... ку і Оршы.

ЗДАРЭННІ

ЗАБОЙЦА. У прадмесці гор. ... (БССР) каля ракі Проня быў зно... труп невядомага. Расследваннем ... ноўлена, што забойцам з'яўляецц... Свіценкоў — ужо судзімы ране... кражу. Акалічнасць гэтага забо... наступная. 61-гадовы Д. Н. Дз... коў — жыхар вёскі Балбечына, Па... таўскага сельсовета, варочаўся на ... манцы з Горак дадому. Разам ... ехаў Е. Свіценкоў, які на асаб... глебе па дарозе задушыў т. Дзем... ва, труп скінуў, а сам паехаў дад...

Забойца арыштаван.

ДЗЁННІК

★ Лекцыя для рабочых і совецкай ... генцыі горада на тэму: «Марксісцка-ле... вучэнне аб прадукцыйных сілах і выт... адносінах» адбудзецца 21 снежня ў 7 ... вечара ў вялікім зале Дома партактыва. ... цыю чытае тав. О. Р. Радзецкі. Уваход ... бодны.

★ Лекцыя для інжынерна-тэхнічных ... нікаў Сталінскага раёна на тэму: «Бар... Плеханава з народніцтвам» будзе прач... 22 снежня ў 7 гадз. вечара ў вялікім ... Дома партактыва. Чытае лекцыю тав. ... Уваход свабодны.

Вык. абавязкі адказнага рэдакта...
Д. Т. ЛЕБЕДЗ...

ПАСТАНОВА № 37

ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА
ад 16 снежня 1938 г.

«АБ МЕРАХ ПАЖАРНАЙ БЕЗАПАСНАСЦІ ПРЫ НАЛАДЖАННІ НОВАГОДНІХ ЁЛАК».

1. Забараніць асвятленне наладжваемых ёлак адкрытым агнём: свечкамі, ліхтарамі і т. д. Асвятленне ёлак павінна быць толькі электрычнае, з добра ізаляванай праводкай.

Электрычнае абсталяванне на ёлках павінна выконвацца вопытным мацёрам.

У месцах масавага збору дзяцей на ёлку павінна быць устаноўлена дзяжурства электрамацёра.

2. Вата, ужываемая для наладжання ёлак, дапускаецца толькі насычаная агнезахоўным саставам.

3. Колькасць дзяцей, дапускаемых у памяшканні, у якіх наладжваецца ёлка, павінна быць строга абмежавана, у адпаведнасці з плошчай памяшкання і колькасцю выхадаў.

4. У час наладжання ёлкі ў грамадскіх месцах (у школах, клубах, дзіцячых садах і т. д.) павінны быць устаноўлены дзяжурствы дарослых, а таксама пажарны пост.

5. Памяшканні, прызначаемыя для наладжання ёлак, і самыя ёлкі павінны быць спачатку агледжаны прадстаўнікамі пажарнай аховы НКВД горада, і толькі з іх санкцыі дапускаць да карыстання.

6. У мэтах шырокага азнаямлення насельніцтва з мерамі пажарнай безапаснасці пры наладжанні ёлак, пажарнай ахове НКВД г. Менска выдаць адпаведныя лістоўкі і плакаты.

7. Адказнасць за падтрыманне парадку ў памяшканні, дзе будзе наладжвацца ёлка, ускладаецца на дырэктароў школ, устаноў, а ў кватэрах — на ўстрайваючага ёлку.

8. Вінаўныя ў парушэнні гэтай пастановы будуць прыцягвацца да адказнасці.

9. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на пажарную ахову НКВД г. Менска.

В. а. старшыні Менскага Гарадскога совета Е. ЛЮБІЧ.
В. а. сакратара Менскага Гарадскога совета С. ТРАЙЧАНСКІ.

БЕЛАРУСКІ БАНК
фінансавання комунальнага і жыллёвага будаўніцтва
(БЕЛКОМУНБАНК)

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ЎСІХ ГАСПАДАРЧЫХ І БЮДЖЭТНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ,

якія маюць разліковыя рахункі і рахункі па фінансаванню капітальнага будаўніцтва ў Белкомунбанку і яго філіялах, што ТЭРМІН ДЗЕЯННЯ ПОЎНАМОЦТВАЎ АСОБ, маючых права распараджацца рахункамі і крэдытамі,

канчаецца 31 снежня 1938 г.

Каб унікнуць стварэння перабояў у правядзенні аперацый у банку, Белкомунбанк рэкамендуе ПРАДСТАВІЦЬ ДА 25 СНЕЖНЯ 1938 г. НОВЫЯ ПОЎНАМОЦТВЫ НА АСОБ, якім будзе дадзена права распараджацца рахункамі і крэдытамі ў 1939 годзе.

На ўсіх асоб, якім будуць прадстаўлены правы першага подпісу, прадстаўляюцца даверанасці, замацаваныя гербавай пячаткай і засведчаныя вышэйстаячай арганізацыяй, маючай гербавую пячатку, або натарыяльнай канторай.

Статутныя арганізацыі, а таксама дзяржоргаиы, прадстаўляюць загады аб назначэнні кіраўнікоў, засведчаныя такім-жа парадкам.

На галоўных і старшых бухгалтароў прадстаўляюцца выпіскі з загаду аб іх назначэнні, засведчаныя вышэйстаячай арганізацыяй.

БЕЛКОМУНБАНК ПАПЯРЭДЖВАЕ, ШТО ПА НЕАФОРМЛЕНЫХ РАХУНКАХ З 31 СНЕЖНЯ БАНКАЎСКІЯ АПЕРАЦЫІ СПЫНЯЮЦЦА.

БЕЛКОМУНБАНК.

Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр
21 снежня
БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫЯ
Абанемент № 44.
Пачатак у 7 г. 30 м. веч. Каса адкрыта з 2 г. дня да 8 г. 30 м. веч. бесперапынна.

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР
21 снежня
МЕНАХЕМ-МЕНДЛ
Абанемент № 9.
Пачатак у 8 г. веч.

Кінотэатр «Чырвоная зорка»
БАЛОТНЫЯ САЛДАТЫ

Кінотэатр «РОДИНА»
НА ГРАНІЦЫ

Кінотэатр «Інтэрнацыянал»
«ДРУЗЬЯ ИЗ ТАБОРА»

Кінотэатр «Спартак»
МЯДЗВЕДЗЬ

Дзіцячы кінотэатр
ПУГАЧОЎ

Кінотэатр «Навіны дня»
1. Саюзкінажурнал № 56.
2. Флагманы Арктыкі.
3. Музей імя С. М. Кірава.

ЗАВОЧНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ МЕНСКАГА ПЕДАГАГІЧНАГА ІНСТЫТУТА імя А. М. ГОРКАГА

паведамляе, што зімовая заліковая сесія студэнтаў-завочнікаў старшых курсаў (II, III і IV) усіх факультэтаў педінстытута будзе праходзіць з 31 снежня 1938 г. па 9 студзеня 1939 г.

Своечасовая яўка студэнтаў-завочнікаў памянёных курсаў абавязкова.

Аб тэрміне склікання зімовай сесіі студэнтаў-завочнікаў першых курсаў педінстытута будзе аб'яўлена дадаткова.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Беларуская кантора „ГЛАВВТОРМЕТ“
(г. Менск, Совецкая 50, тел. 21-920)
КУПЛЯЕ і ПРЫМАЕ
АД ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, УСТАНОЎ, СОЎГАСАЎ, МТМ, МТС, КАЛГАСАЎ, ДОМАЎПРАЎЛЕННЯЎ і ПРЫВАТНЫХ АСОБ.

ЛОМ ЧОРНЫХ МЕТАЛАЎ
ЛОМ КАЛЯРОВЫХ МЕТАЛАЎ





КУПЛЯ і ПРЫЁМКА чорных і каляровых металаў
па прэйскурантных цэнах, зацверджаных СНК СССР, праводзіцца
ад прадпрыемстваў і ўстаноў—ПЛЯЦОЎКАМІ ў гор. МЕНСКУ—тэл. 20-834, ВІЦЕБСКУ — тэл. 11-65, ГОМЕЛІ—тэл. 13-08, МАГІЛЕВЕ—тэл. 90-63, БАБРУЙСКУ, ОРШЫ і РЭЧЫЦЫ,
а ў астатніх раёнах—АГЕНТАМІ «ГЛАВВТОРМЕТ; ад калгасаў і насельніцтва — ЛАРКАМІ «ГЛАВВТОРМЕТ» і заготпунктамі контрагентуры сістэм спажыўкааперацыі, Саюзуціля і промкааперацыі.

ЗБІРАЙЦЕ і ЗДАВАЙЦЕ ЛОМ ЧОРНЫХ і КАЛЯРОВЫХ МЕТАЛАЎ

ДА ЎВАГІ ЧЫТАЧОЎ І ПАДПІСЧЫКАЎ НА ВЫДАННІ ВЫДАВЕЦТВА „ЗВЯЗДА“

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1939 г
НА ГАЗЕТУ
„ЗВЯЗДА“ —
Орган ЦК і Менскага абкома КП(б)Б.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
1 мес. — 2 р. 50 к. 6 мес. — 15 р.
3 мес. — 7 р. 50 к. на год — 30 р.

НА ЖУРНАЛЫ:

„БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ“ — ПАЛІТЫКА-ЭКАНАМІЧНЫ ЖУРНАЛ, орган ЦК КП(б)Б.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
1 мес. — 40 к.
3 мес. — 1 р. 20 к.
6 мес. — 2 р. 40 к.
на год — 4 р. 80 к.

„Работніца і калгасніца Беларусі“ — ДВУХТЫДНЕВЫ ЖУРНАЛ, выданне ЦК КП(б)Б.
У кожным нумары журнала ёсць ВЫКРАЙКІ новых фасонаў жаночай і дзіцячай вопраткі.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
1 мес. — 40 к.
3 мес. — 1 р. 20 к.
6 мес. — 2 р. 40 к.
на год — 4 р. 80 к.

ПАМЯТАЙЦЕ, што доўгатэрміновая і своечасовая аплата падпіскі ГАРАНТУЕ АКУРАТНУЮ І БЕСПЕРАБОЙНУЮ ДАСТАЎКУ.

СПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА!

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: канторай выдавецтва «Звязда» — Менск, Совецкая, 49, раённымі канторамі сувязі, усімі паштовымі аддзяленнямі, агентствамі і пісьманосцамі, а таксама ўсімі грамадскімі арганізатарамі на прадпрыемствах, установах і калгасах.

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б «ЗВЯЗДА».

ДРУКАРНІ «ЗВЯЗДА»
патрэбны:
РАБОТНІКІ ПАЖАРНА-ВАРТАВОЙ АХОВЫ.
Звяртацца: Совецкая, 49, другі паверх, пакой № 8.

У аддзел аб'яў званіце па тэлефону № 25-384

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 49. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352; намесніка рэдактара — 25-188; сакратарыята—20-880. Аддзелаў: партыйнага — 21-353; совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412; прамысловага — 21-356; сельскагаспадарчага — 21-846; літаратуры, мастацтва, навукі і асветы — 23-955; мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189; аддзела пісем — 20-844, 21-399, 21-885; ілюстрацыйнага і стыль-рэдактуры — 21-556; заг. выдавецтвам — 21 358; аб'яў — 25384.

Уп. Галоўлітбела № К—5950. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. М., М., Ш.